© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПАГОНЯ

Чацвер
23 сакавіка 2000 г.
№ 9 (456)
Кошт 70 рублёў

Пойдзем на мітынг!

Гарадзенскі гарвыканкам даў згоду на правядзенне 25 сакавіка мітынгу «За лепшае жыццё ў вольнай Беларусі», прысвечанага Дню Волі.

Аднак планы арганізатараў святочнага мерапрыемства рашэннем выканкама былі парушаны. Планавалася правесці яго ў цэнтральнай частцы горада каля Палаца тэкстыльшчыкаў. Гарадскімі ўладамі месцам мерапрыемства вызначаны гарадскі парк імя 40-годдзя камсамолу. Напалову скарочаны і час мерапрыемства - мітынг дазволены з 12.00 да 13.30.

Як адзначыў старшыня Гарадзенскай рады БНФ «Адраджэньне» Сяргей Мальчык, нягледзячы на ўсе перашкоды свята ў Дзень Волі ў горадзе адбудзецца. З прычыны таго, што многія гарадзенцы ўжо нават забыліся месца знаходжання запушчанага парку, арганізатары запрашаюць жыхароў горада сабрацца на Савецкай плошчы за Палацам тэкстыльшчыкаў у 11.30 і разам прайсці да месца правядзення мітынгу.

Арганізатары падрыхтавалі цікавыя сюрпрызы і запрашаюць гарадзенцаў прыходзіць на свята разам з сем'ямі і суседзямі.

Ул. інф.

Віленчукоў цягне ў Гродна...

Гродна наведала дэлегацыя прадстаўнікоў адміністрацыі Віленскага павету (Літва).

На сустрэчы ў Гарадзенскім аблвыканкаме 16 сакавіка бакі абмяняліся інфармацыяй аб сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэгіёнах і абмеркавалі перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж імі.

Дамоўлена падрыхтаваць усебаковую інфармацыю для інвестараў і наладзіць у Вільні і Гродне семінары для прадпрымальнікаў.

Ася Куніцкая

...а лідчукоў - у Вільню!

З пачатку 2000 года на ўчастку Лідскага пагранічнага атрада было спынена каля 10 спробаў кантрабанднага вывазу з Беларусі ў Літву буйных партый цукру на агульную суму каля 7 мільёнаў 700 тысяч рублёў.

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта пагранвойскаў, парушальнікі дзейнічаюць па адпрацаванай схеме: назапашваюць цукар, складзіруюць яго ў лесе каля мяжы, а затым спрабуюць невялікімі партыямі перапраўляць у суседнюю дзяржаву.

Некалькі такіх выпадкаў адбылося напрыканцы лютага. Тады ў раёне вёскі Падзітва пры спробе перасячэння беларуска-літоўскай мяжы з Беларусі ў Літву па-за пунктамі пропуску былі затрыманыя два легкавыя аўтамабілі з прычэпамі пад кіраваннем беларускіх грамадзянаў.

Пры іх даглядзе памежнікі знайшлі 30 мяшкоў цукру агульнай вагой паўтары тоны, якія парушальнікі спрабавалі нелегальна вывезці за межы краіны. Падчас агляду месца затрымання, памежнікі знайшлі ў лесе патайнік, у якім захоўвалася яшчэ больш за 5 тон цукру.

У сувязі з паспяховымі дзеяннямі памежнікаў па прадухіленні спробаў кантрабанднага вывазу з Беларусі цукру камандуючы войскамі Аляксандр Паўлоўскі прыняў рашэнне заахвоціць 19 памежнікаў Лідскага пагранатрада, якія найбольш вызначыліся. Ім будуць уручаны каштоўныя падарункі, граматы і нагрудныя знакі.

Заахвочаны будзе і адзін з мясцовых жыхароў, які актыўна дапамагаў пры затрыманні партыі цукру.

Вячаслаў Будкевіч

24, 25 сакавіка - воблачна, з праясненнямі, без ападкаў, вецер паўночна-заходні - 1-6 м/с. Тэмпература паветра ўначы -1...0, удзень +5...+10.

Сёння - Дзень метэаролага. Віншуем вас, нашы шаноўныя партнёры! Бясхмарнага вам неба і цёплага сонейка!

З Днём Волі-2000!

Віншаванне Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Паважаныя суайчыннікі!

9 сакавіка 1918 года Беларусь была названа Народнай Рэспублікай, а ў ноч з 24 на 25 сакавіка Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла «Трэцюю Устаўную Грамату», у якой БНР абвяшчалася «незалежнай і свабоднай дзяржавай». Усё гэта адбывалася вясною, у пару сонца і надыходу цяпла, абуджэння прыроды і людскіх надзеяў. І хоць Радзе БНР не ўдалося правесці нейкіх значных эканамічных рэформаў і ўмацаваць заяўленую незалежнасць сваёй дзяржавы, але яна абнародавала галоўныя правы і свабоды чалавека, указала, што Беларусь павінна ахапіць усе беларускія землі і сумежныя часткі Вялікаросіі, дзе ёсць беларусы, адмовілася прызнаць зневажальную для Беларусі Брэсцкую дамову, заключаную бальшавіцкім урадам Расеі з Германіяй без удзелу прадстаўнікоў з беларускага боку, а ў апошні перыяд свайго існавання шмат зрабіла ў вырашэнні праблемаў асветы.

Сказанае сведчыць пра тое, што Днём незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь павінен лічыцца менавіта дзень 25 сакавіка. Трэба аддаць належнае дзяржаўным і грамадскім дзеячам тых гадоў і тым, хто захоўваў і працягвае захоўваць за мяжою іх традыцыі. Пашану яны заслужылі сваёй барацьбой за свабоду і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны.

Сімвалічна, што і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята таксама вясною - 15 сакавіка 1994 года. Нядаўняе святкаванне гэтага дня паказала, што ўрачыста аб'яўленая ў той далёкі 1918 год ідэя незалежнасці Беларускай дзяржавы працягвае жыць і сёння. Беларускі народ не хоча скарыцца дыктатарскаму рэжыму, які ўстанавіўся ў краіне пасля дзяржаўнага перавароту (лістапад 1996 года). Сёння гэты рэжым з'яўляецца не толькі нелегітымным, але і крымінальным, паколькі па факце захопу і ўтрымання ім дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам распачата крымінальная справа. І ніякія хлусня і запалохванні не могуць перашкодзіць адзначаць 25 сакавіка - Дзень Волі і Незалежнасці Беларусі.

Віншую ўсіх суайчыннікаў, дзе б яны ні знаходзіліся ў гэты дзень, са Святам! Жадаю вам, дарагія сябры, сілы, мужнасці і поспехаў ва ўсіх вашых справах.

Няхай жыве вольная, незалежная, дэмакратычная Рэспубліка Беларусь!

Сямён Шарэцкі

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY ·

Беларуская служба Радыё Свабода

Новыя хвалі ад 24 студзеня 2000 году

ЧАС	kHz	ХВАЛІ
18.00-19.00	7295	41
	9610	31
	11725	25
	15565	19
22.00 - 23.30	6105	49
	9535, 9750	31
	11865	25
06.00 - 07.00	6065	49
	7295	41
	9636, 9750	31

Сярэднія хвалі - 576 і 612 kHz

Адрас: 220005, Менск-5, п/с 111. Vinohradska 1, Praha 11000 CZ.

Internet WWW.SVABODA.ORG

Настройцеся на «свабоду»!

Тры Віленскія мучанікі - за беларускі народ

У нядзелю, 26 сакавіка, а 17 гадзіне ў Каложскай царкве пройдзе служба-акафіст тром віленскім мучанікам Антонію, Іаану, Яўстафію за беларускі народ.

Пасля службы адбудзецца сустрэча з вядомым гарадзенскім пісьменнікам і краязнаўцам, заслужаным настаўнікам Апанасам Пятровічам Цыхуном.

25 сакавіка - Нацыянальнае сьвята ўсіх беларусаў

Нягледзячы на шматгадовы ўціск і гвалтоўную асыміляцыю беларускі народ 25 сакавіка 1918 году абвясьціў на ўвесь цывілізаваны сьвет пра сваю незалежнасьць, якая была потым прызнаная цэлым шэрагам эўрапэйскіх краінаў. Разам зь незалежнасьцю абвяшчаліся й дэмакратычныя свабоды для ўсіх грамадзянаў розных нацыянальнасьцяў, што жылі на той час у этнаграфічных межах Беларусі. Гістарычная нацыянальная сымболіка ўрэшце сталася дзяржаўнаю. Адразу ж распачалося ўтварэньне нацыянальнае сыстэмы адукацыі й культуры: зьявіліся беларускія школы і бібліятэкі, выдавецтвы і газэты, музэі і тэатры. Назовы Беларусь і Беларусы былі канчаткова замацаваныя на палітычнае і этнічнае мапе Эўропы.

Таварыства беларускае мовы імя Францішка Скарыны віншуе з гэтым найгалоўным сьвятам нашае дзяржавы як грамадзянаў Беларусі, гэтак і суайчыньнікаў замежжа, і жадае ўсім заўжды трымацца сваіх каранёў, ведаць і распаўсюджваць сваю мову, гісторыю й культуру!

Жыве вольная і дэмакратычная Беларусь!

Кіраўніцтва ТБМ
20 сакавіка 2000 году

Натальля Арсеньнева

25 сакавіка

Ён прыйдзе, гэты дзень!
Ён не прыйсьці ня можа!
Ён прыйдзе -
й загудзе вясновы буралом,
пакрышыць, разьмяце,
раскідае, зьнічтожыць
усё, што нам шляхі
да хаты замяло!
Ці чуеце?
Аб ім
шасьціць быльнёг аселіц,
пяюць вятры ў лазе,
і звоніць крыгаў лёд.
Ахвяраю крыві,
а Слова стане Целам,
і ўжо ніколі больш не ўстане
Чорны Год.
Няхай бярэмя він
прыгнула нас,
і крылы
апалі
й хлеб чужы нясмачны і важкі,
нас апавіў
тугой агорклы вырай, -
трывайма!
Ён ідзе -
Вялікі Сакавік!
Ідзе...
й пад ногі рунь
яму кладзецца, таюць
сьнягі, на поплавах зяленіцца
трава...
Радзіма!
Беларусь
Каханая, сьвятая!
Благаславі нас жыць
і веру захаваць!

1950 год

«Стукачы» на гістфаку

На гістарычным факультэце Гарадзенскага універсітэта зноў узнялася хваля рэпрэсіяў супраць студэнтаў. На думку саміх студэнтаў, звязана яна ў першую чаргу з Маршам Свабоды, які адбыўся 15 сакавіка.

Кіраўніцтва факультэта ўжо адкрыта гаворыць пра «стукачоў», якія працуюць у кожнай універсітэцкай групе і даносяць у дэканат усю інфармацыю пра вальнадумства.

Гэтым разам галоўнае пытанне, якое задавалася апазіцыйным студэнтам - «Дзе былі 15 сакавіка?». Тых, чые адказы не задаволілі кіраўнікоў гістфаку, пагражаюць выклікаць на рэктарат.

«Стукачаства» набірае ва універсітэце шырокі размах. І хоць «стукачы» дзейнічаюць досыць прафесійна, студэнты кажуць, што іх лёгка вылічыць - большасць з іх мае БПСМаўскую прапіску.

Павал Мажэйка

Зноў пабілі шыбы

У памяшканні Гарадзенскай гарадской рады БНФ «Адраджэньне» злаўмыснікі пабілі шыбы ў вокнах. Гэта шосты выпадак за апошні час. Заўважана, што напады супадаюць па часе з арганізацыяй Фронтам агульнанацыянальных ці гарадскіх акцыяў.

Так сталася і на гэтым разе. У дзень правядзення «Марша Свабоды-2» глыбокай ноччу ў вокны штабкватэры БНФ паляцелі камяні. Неўзабаве з'явіўся патруль у складзе трох міліцыянтаў. Звон пабітага шкла разбудзіў жыхароў суседніх дамоў. Калі адна з жыхарак запытала праваахоўнікаў, чаму яны па гарачых слядах не прымаюць мераў па затрыманню хуліганаў, то патрульныя прамовілі: «А вы бачылі, хто пабіў? Не? Дык ідзіце дадому і не лезьце не ў свае справы!». Старшыня гарадской рады БНФ Сяргей Мальчык падаў на імя начальніка Ленінскага РАУСа спадара С.І.Васілеўскага заяву з патрабаваннем правесці раследаванне па факту разбіцця шыбаў і службовае даследаванне па адсутнасці рэагавання нараду міліцыі на парушэнне правапарадку.

Антон Лабовіч

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Гарадзенцы на «Маршы Свабоды-2»

Такім чынам, «Марш Свабоды-2» адбыўся. Можна падводзіць яго вынікі. Па колькасці ўдзельнікаў меркаванні падзяліліся: называюцца лічбы ад 3 да 50 тысяч чалавек. Зразумела, мінімальныя лічбы належаць рэжыму, а максімальныя - апазіцыі. Ісціна недзе пасярэдзіне.

Калі казаць пра настрой удзельнікаў Марша, то насуперак пахмурнаму надвор'ю на сэрцы ў людзей было светла. Што нас здзівіла, насцярожыла, уразіла і адначасова ўзрадавала, дык гэта невялікая колькасць міліцыі і абсалютна мірнае яе стаўленне да дэманстрантаў. Мы былі гатовыя да ўсяго, але гэта перасягнула нашыя чаканні. Не назіралася ніякіх правакацыяў, і людское мора бушавала ў межах дапушчальных нормаў.

Мы ўдзельнічалі ў «Маршы Свабоды-2» разам з прадстаўнікамі БНФ г.Гродна. Ужо ў 18.00 мы былі на месцы і сталі разгортваць свае транспаранты і плакаты, падрыхтаваныя яшчэ дома. Там былі і лозунгі супраць рэжыму Лукашэнкі, і бел-чырвона-белыя сцягі, і плакаты з малюнкамі.

Нарэшце, ўсё было падрыхтавана, у 18.15 мы ўліліся ў калону дэманстрантаў і пайшлі па шырокіх вуліцах сталіцы. На сваім шляху сустрэлі шматлікіх гледачоў, якія, калі б уліліся ў шэсце, дык павялічылі б яго недзе ў два разы.

Мы ішлі, выгукаючы лозунгі, асноўным з якіх быў: «Жыве Беларусь!» Жанчыны спявалі прыгожыя песні. Праз нейкія дзесяць метраў - згуртаваная купка моладзі. Ізноў песні...

Ледзьве не на кожным павароце калоны сталі аўтобусы айчыннай вытворчасці, з люкаў якіх былі бачныя людзі з відэакамерамі. Яны ніяк не рэагавалі на прапановы дэманстрантаў: «Што ты там робіш? Вылазь і пойдзем з намі!» Адчувалася дысцыпліна і вывучка. Яны метадычна здымалі на відэакамеру ўдзельнікаў «Марша Свабоды-2». Цікава: навошта? Цяпер мы застанемся ў відэаархівах спецслужбаў. Мо ўжо надышоў час збіраць рэчы і рыхтавацца да прыезду чорнага варанка? Мы ішлі пасярэдзіне шэсця, якое здавалася бязмежным. Гледзячы перад сабою, мы не бачылі галавы калоны, а аглядаючыся назад - яе хваста. Калі б нас было тры тысячы, дык хіба ж было так? І вось каля 20.00 мы прыйшлі да канцавога пункту нашага маршруту, дзе над морам людзей ўзвышалася трыбуна. На ёй былі арганізатары «Марша Свабоды-2» і музыканты.

Моладзь скандзіравала лозунг «Беларусь у Еўропу - Лукашэнку ў жопу!»

У 20.00 пачаўся мітынг. Першым выступіў з прамовай Анатоль Лябедзька. Ён звярнуўся да прысутных з горкімі словамі пра тое, што яго маці атрымала пенсію - сем мільёнаў рублёў, і што гэтага хопіць толькі на два кілаграмы добрай каўбасы, што так жыць нельга. Другая палова ягонай прамовы была аптымістычнай. Ён запэўніў нас, што Беларусь будзе жыць лепей.

Далей выступалі Аляксей Кароль, Людміла Гразнова, Сямён Домаш, Дзмітрый Бандарэнка, Міхаіл Чыгір, Юрый Хадыка, Вінцук Вячорка. Прамоўцы спрабавалі гаварыць сцісла і дакладна.

Станавілася халадней, але мы не адчувалі марозу. Было не да гэтага. Усе слухалі лідараў апазіцыі. Кожнае іх слова сагравала і натхняла.

Юрый Хадыка: «Нам абрыдла жыць у жабрацкай Беларусі. Беларусі патрэбныя змены!»

Мікалай Статкевіч: «Улада ў Беларусі - хамская ўлада, але мы прымусім яе слухаць нас!»

Вінцук Вячорка: «Расея хоча зрабіць Беларусь сваёй ваеннай калоніяй. Беларускі народ узніме свой голас супраць гэтага. Мы будзем сеяць зерні, з якіх узыйдзе незалежнасць Беларусі!»

У 20.30 мітынг завяршыўся і пачаўся канцэрт групы «НРМ», лідар якой вітаў удзельнікаў «Марша Свабоды-2», асабліва моладзь. Таксама ён папрасіў прабачэння за тое, што група не здолее доўга граць з-за холаду. І іх можна зразумець. Лужыны сталі пакрывацца ільдом. Падчас канцэрту людзі старэйшага і сярэдняга пакалення сталі разыходзіцца. А моладзь засталася. Хіба магла яна адмовіцца ад такога падарунку?

Бліц-апытанне ўдзельнікаў «Марша Свабоды-2»

«Апазіцыя выйшла на вуліцы. Што, на Вашу думку зробіць рэжым, каб дэманстрантаў на гэтых вуліцах не было?»

Уладзімір Станіслававіч Рыбак, г.Гродна: «Ёсць тры мажлівыя шляхі для ўлады Беларусі, каб ачысціць вуліцы ад апазіцыянераў: заходні, усходні і мясцовы. Заходні азначае - пайсці на перамовы з апазіцыяй, даць ёй сродкі масавай інфармацыі, спыніць палітычныя ганенні. Зараз гэты шлях для ўлады непрыдатны. Усходні - мне, як інструктару па ўсходніх адзінаборствах, бачыцца ў адным з прынцыпаў дзюдо, які заключаецца ў наступным: «паддайся, каб атрымаць перамогу». Гэта азначае, што ўлада робіць выгляд, нібыта ідзе на ўступкі, тым самым усыпляе пільнасць апазіцыйных партыяў. Потым знянацку ўдарыць і знішчыць дэмакратычны рух у краіне. Ну і трэці шлях, мясцовы, самы просты і больш прыдатны для ўлады, бо не патрабуе вялікіх разумовых высілкаў. Груба, нягледзячы на ўсе чалавечыя законы і абапіраючыся на магутны апарат спецслужбаў, рэпрэсаваць апазіцыю так, каб ужо не засталося тых, хто будзе выходзіць і мітынгаваць.»

«Што прымусіла Вас удзельнічаць у «Маршы Свабоды-2»?»

Павел Іванавіч, 49 гадоў, г.Менск: «Абрыдла, абрыдла, і яшчэ раз абрыдла цярпець такое жыццё, як наша. Я ўвесь час працаваў, страціў здароўе, а ў выніку не маю нічога. Не магу нават, як належыць, дапамагчы сваім дзецям. Крыўдна. Раней я верыў Лукашэнку, думаў, што, нарэшце, прыйшоў чалавек, які ўсё наладзіць, але я ў ім расчараваўся. І сваім удзелам у «Маршы Свабоды-2» спрабую выправіць сваю памылку, зробленую ў 1994 годзе на выбарах у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.»

«Якімі Вы бачыце вынікі «Марша Свабоды-2»?»

Ігар Банцар, г.Гродна: «Марш удаўся, ды і як магло быць інакш. Апазіцыя рыхтавалася, а рэжым актыўна дапамагаў ёй сваім некампетэнтным кіраваннем. У дадзены момант я не гатовы абмяркоўваць вынікі шэсця - цяжка адразу ўсвядоміць яго маштабы. Магу сказаць адно - выразна адчуваецца згуртаванасць апазіцыі. Толькі так можна чагосьці дамагчыся.»

«Жадалі б Вы з'яўлення «Маршаў Свабоды-3, 4, 5» і г.д. Ці будзеце прымаць у іх удзел?»

Алесь, г.Менск: «Жадаю і буду ўдзельнічаць. Я думаю, пачын праб'е сабе дарогу. Ведаю, што могуць пераследаваць, але не баюся гэтага. Вось Вы таксама ўдзельнічаеце, прыехалі з Гродна. Я глыбока веруючы чалавек і адчуваю, што Бог на нашым баку, і таму ў нас усё будзе добра. Калі будзеце пісаць у газету, перадавайце прывітанне ўсім удзельнікам «Марша Свабоды-2» і тым, хто іх падтрымлівае, але не здолеў узяць удзел. На наступны «Марш» яшчэ болей сяброў з сабою прывяду.»

Я апытаў шмат людзей, задаючы адны і тыя ж пытанні. Адказы, што найбольш спадабаліся мне, пададзеныя вышэй. Але агульная тэндэнцыя наступная: усе вераць у поспех і гатовыя змагацца.

Эдуард Крупянскі

Заява кардынацыйнае Рады дэмакратычных сілаў

Менскі гарвыканкам на сваім паседжаньні 17 сакавіка беспадстаўна адмовіў вялікай групе грамадзянаў краіны ў законным праве правесьці шэсьце й мітынг у гонар Дня Незалежнасьці на цэнтральных вуліцах сталіцы 25 сакавіка сёлета. Спасылкі на нібыта парушэньні грамадзкага парадку й дамоўленасьцяў з уладамі падчас Маршу Свабоды-2 15 сакавіка зьяўляюцца бездапаможнай хлусьнёй дзясяткі тысяч удзельнікаў Маршу, журналісты, замежныя назіральнікі дый самі гарадзкія ўлады бачылі на свае вочы й пацьвярджалі ўзорны парадак падчас шэсьця.

Насамрэч рэпрэсіўнае рашэньне гарадзкіх уладаў выклікана істэрыкай Лукашэнкі пасьля 15 сакавіка. Ён пабачыў, як губляецца глеба ў яго пад нагамі, як выросла колькасьць людзей, гатовых насуперак страху, забаронам і хлусьлівай прапагандзе выйсьці на вуліцы й пляцы, каб сказаць рашучае «НЕ» спробам здаць незалежнасьць краіны ды падтрымаць мірны шлях пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі праз палітычныя перамовы.

Забарона ладзіць мірныя дэманстрацыі ў Менску перакануча паказвае, чаго варты дырэктыўна абвешчаны «шырокі дыялёг».

Мэта гэтай прапагандысцкай кампаніі рэжыму - падмяніць «шырокім дыялёгам» палітычныя перамовы і апраўдаць адсутнасьць дэмакратычных свабодаў у Беларусі.

Тым ня менш, да 25 сакавіка яшчэ ёсць час, і ўлады маюць магчымасьць засьведчыць беларускаму грамадзтву ды міжнароднай супольнасьці сваю добрую волю да стварэньня атмасфэры даверу ў нашай краіне. Шэсьце й мітынг 25 сакавіка адбудуцца, гэтаксама, як адбываліся яны штогод ад 1987 году, і ўся адказнасьць за магчымыя правакацыі падчас акцыяў будзе ляжаць на ўладах.

Вік спадзяецца...

19 сакавіка 2000 года кіраўнік кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі Ханс-Георг Вік даслаў Вінцуку Вячорку копію свайго ліста ад 16 сакавіка, якая адрасавана цэламу шэрагу высокапастаўленых чыноўнікаў ураду і г.Менска.

У гэтым лісце Ханс-Георг Вік выказвае сваё задавальненне з нагоды правядзення дэманстрацыі, якая адбылася 15 сакавіка, а таксама спадзяванне на тое, што наступная дэманстрацыя - 25 сакавіка 2000 года - таксама будзе праведзена падобным чынам.

Далей у лісце да чыноўнікаў гаворыцца наступнае: «Адпаведна інструкцыі прэзідэнта ўлады прынялі супрацьлеглае рашэнне. Пра гэта можна толькі шкадаваць. Дадзенае рашэнне не можа быць патлумачана нічым, што б адбылося 15 сакавіка 2000 года. Я не страціў шанец паведаміць дзеючаму старшыні, а таксама ўладам дзяржаваў-сябраў АБСЕ пра гэты новы акт пагарджання асновай правоў чалавека.

Тым не менш, я спадзяюся, Вы знойдзеце спосаб, пры дапамозе якога дэманстранты здолеюць 25 сакавіка 2000 года выказаць свой пункт гледжання мірным і эфектыўным спосабам.»

Ул.інф.

Папярэджаньне для тых, хто блытае Кобрынь з Курманаеўкай!

Хачу паведаміць вам пра падзеі, сьведкам якіх я быў. Гаворка ідзе пра антыфашыстоўскую акцыю, якую 12 сакавіка 2000 году правёў у Кобрыне Берасьцейскі аддзел «КРАЮ» разам з кобрыньскімі сябрамі.

Акцыю распачалі адразу з чыгуначнага вакзалу. Горад зьдзівіў багацьцем фашыстоўскае прапаганды, якая сустракалася літаральна на кожным кроку. Дзіўна, як за тыя некалькі год, што атабарыліся ў Кобрыне баркашоўцы, усе кобрыньцы пагалоўна не ўступілі ў іхныя шэрагі. Але зараз уся гэтая брыдота была бязьлітасна сарваная ды замаляваная.

Краёўцы накіраваліся да рэгулярнага месца збору дамарослых «акадэмікаў» з РНЕ. Па шляху хлопцы раздавалі свае прашпэкты й буклеты пра гісторыю Беларусі (асабліва пра тое, чым «праславіўся» ў Беларусі Суворaў, культ якога ў Кобрыне не ў апошнюю чаргу паўплываў на пладавітасьць мясцовага РНЕ); пра дзейнасьць сваёй арганізацыі, клеілі антыфашыстоўскія ўлёткі. Многія з удзельнікаў акцыі былі ў вайсковай форме. Баркашоўцы, здалёк убачыўшы іх, пасьпелі ўцячы. Лавіць іх ня сталі...пакуль.

Потым краёўцы вырашылі правесьці антыфашысцкі «лікбез» сярод жыхароў мястэчка. Таму яны прайшлі праз увесь горад распаўсюдзілі шмат літаратуры антыбаркашоўскага зьместу.

На пытаньне аднаго з мясцовых жыхароў: «А дзе тут фашысты?», адзін з краёўцаў адказаў: «А хіба РНЕ не фашысты?». «Гэтыя? Гэтыя горш за фашыстаў!», - удакладніў кобрынец.

Калі зьбіраліся ад'язджаць, на вакзале да хлопцаў дачапіліся-такі міліцыянты, але, пагаманіўшы з адным з удзельнікаў акцыі й атрымаўшы тузін ўлётак, вырашылі нікога не затрымліваць.

Гэта акцыя - не апошняя, якая была праведзена ў Кобрыне беларускімі антыфашыстамі. І калі гэтая акцыя зьяўлялася папераджальнай для тых, хто блытае Кобрынь з Курманаеўкай, дык наступным разам аматарам славянафашызму не дадуць так проста сыйсьці.

Волат з-пад Берасьця

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны выказвае шчырую ўдзячнасць за ахвяраванні удзельнікам Маршу Свабоды-2, які адбыўся ў Менску 15 сакавіка 2000 года. Ахвяраваныя імі 41 564 рублі будуць накіраваныя на падтрымку газеты «Наша слова» і правядзенне конкурсу на лепшую вясковую школу.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Гарадзенскія школьнікі выбіраюць... расейскага прэзідэнта

Выключна парадаксальная з гледзішча чалавечага розуму падзея адбылася ў гарадзенскай сярэдняй школе N9. Настаўніца гісторыі Ларыса Шаўчэнка прапанавала беларускім школьнікам сачыненне на тэму «За каго я галасаваў бы на выбарах прэзідэнта Расеі і чаму?».

Сваю прапанову настаўніца абгрунтавала жаданнем пабачыць агульнаадукацыйны ўзровень сваіх выхаванцаў, іх палітычную свядомасць.

Ва ўступным слове яна натхнёна распавядала пра Уладзіміра Пуціна - які ён інтэлектуал, як у ім адлюстроўваецца ўся Расея, пра аблічча рускага народа.

«Перадвыбарчая» агітацыя прынесла ашаламляльныя вынікі. Зюганаў з Жырыноўскім «набралі» сціплыя - па аднаму «за». Усё астатняе забраў Пуцін. «Ён заўсёды маўчыць, калі іншыя гавораць, затое шмат робіць...», «ён добры, абараняе людзей...» - пісалі пра будучага расейскага прэзідэнта беларускія дзеці.

І ўсе засталіся задаволеныя. Пуцін - упэўненай перамогай у 9-й школе Гродна; настаўніца - дзеці апраўдалі яе мроі, чаканні і спадзяванні; школьнікі - за «выбарамі» праляцеў час і не давялося адказваць хатняе заданне.

Толькі вось нам нешта незразумела.

Хутка выбары прэзідэнта ў Амерыцы, на носе выбары-перавыбары ў суседняй Польшчы, у Беларусі самой урэшце рэшт нейкія выбары, перамовы ды Марш Свабоды. Аднак паважаная настаўніца вырашыла на карысць такой далёкай для Гродна Расеі. Што гэта - бальзам на старэчыя, яшчэ з савецкіх часоў раны, ці тая самая «руская школа», якая на думку Мураўёва-Вешальніка, што патапіў ў крыві паўстанне Кастуся Каліноўскага, павінна дарабіць тое, чаго не дарабіў «рускі штык»?

Далей - яшчэ горш. Наўкола, адусюль - з экрана, з радыё, з газетаў крыкам крычаць пра беларускую моладзь, якая па вушы загразла ў злачынствах. Маўляў, усе яны наркаманы, алкаголікі, прастытуткі, «отморозки» і дармаеды. Толькі і робяць, што глядзяць баявікі, дзе забіваюць, рэжуць, гвалцяць. А цяпер вось яшчэ і сачыненні даюць пісаць. Пра Пуціна. Які прыйшоў ва ўладу на крыві цэлага народа і чачэнцаў «мочыць у сарціры».

Што робім, шаноўныя настаўнікі? Падвышаем агульнаадукацыйны ўзровень, палітычную свядомасць? Дарога ў пекла заўсёды выкладзена добрымі намерамі.

Іван Паўлёнак

Стаім з працягнутай рукой...

У Беларусі налічваецца 3,5 тысячы дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі, адна траціна якіх - са складанымі. 40 тысяч дзетак жыве з адным з бацькоў. Каля 10 тысяч немаўлятаў нараджаецца па-за шлюбам. Кожная другая сям'я распадаецца. Гарадзеншчына не з'яўляецца выключэннем. З 308 тысяч непаўналетніх - 50 працэнтаў медыкі прызналі хворымі. Летась 600 дзяцей засталіся без аднаго з бацькоў. 400 - поўныя сіроты.

Дзяржава імкнецца дапамагчы маладому пакаленню грамадзянаў краіны. У 1998 годзе была прынята праграма «Дзеці Беларусі». Яна мела свае накірункі - «Настаўнік», «Сельская школа», «Замежныя мовы» і г.д. Вобласць распрацавала адпаведную рэгіянальную праграму. З вялікай ідэалагічнай помпай дзяржаўныя СМІ цяпер распавядаюць пра акцыі прэзідэнцкай праграмы «Нашы дзеці». Тады мясцовае чынавенства па разнарадцы раз'язджаецца па дзіцячых дамах ды іншых сацыяльных установах. Пад наглядам відэакамераў начальнікі раздаюць дзецям падарункі. Іх атрымлівае прыкладна пяць тысяч дзяцей Гарадзеншчыны. Улады таксама праяўляюць клопат пра малалетніх інвалідаў, дзяцей воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія паклалі галовы ў Афганістане, сірот і дзетак, якіх абмінула шчаслівая доля. Разам такіх дзяцей набіраецца да 74 тысяч. Але ці вырашаюць праблему разавыя падачкі?

Пачытаеш дзяржаўны друк, і ствараецца ўражанне, што ўся Беларусь жыве на сродкі дабрачынных ахвяраванняў і дапамог. Дзесяткі грамадскіх арганізацыяў і фондаў сацыяльнай накіраванасці нібыта спаборнічаюць у справаздачнасці: колькі і хто каго накарміў, апрануў, даў абутак, вывез на аздараўленне, прывёз цацкі, пагладзіў па галоўцы, пусціў слязу. Сродкі масавай інфармацыі выкарыстоўваюцца нібыта для апраўдання існавання ўсялякіх фондаў, фондзікаў, асацыяцыяў, установаў. А там працуюць дзядзькі і цёткі, якім таксама хочацца жыць, і жыць добра. Што там з тых сабраных сродкаў застаецца няшчасным дзеткам, аднаму Богу вядома.

Сацыяльна пакрыўджаных малалетніх будзе ўсё больш. Пакуль дзяржава не парупіцца пра сапраўдную эканоміку, не ўздыме жыццёвы ўзровень кожнага грамадзяніна. Ці ў крайнім выпадку, не будзе перашкаджаць людзям у іх памкненні самастойна наладзіць уласны дабрабыт. Не трэба рабіць ласку і шырокім жэстам мецэната (за чужыя грошы) запрашаць старых людзей на бясплатныя абеды. Людзі згараюць ад сораму і пазаўрадавых арганізацыяў гуманітарнай дапамогі. Гэта ж такую кармушку перакрыць!

Адзінае, што прыдумала родная дзяржава, дык гэта стварыла дэпартамент па гуманітарнай дапамозе на чале з сумнавядомым паплечнікам беларускага правіцеля спадаром Кучынскім. Капіталістаў штодня па тэлебачанні размазваюць, паказваюць дасланае бярэмо, трасучы яго перад тэлекамерамі, маўляў, гляньце, што нашым людзям падсоўваюць! Сапраўды, і зношанае бывае, і тэрміны захавання пратэрмінаваныя. Дык адмоўцеся, не бярыце анучы, не цягніце ў свае норы-сховішчы, пакажыце характар і чалавечы гонар! Дзе там!..

Што да дзяцей, то мы, старэйшыя, старанна лепім з іх сваё падабенства. Змалку прывучаем не зарабляць уласным мазалём, а спадзявацца на добрага дзядзьку, на міску пустога крупніка, на паліто з чужога пляча. Так і жывем, пазіраючы на багаты суседскі падворак: ці не падкіне хто чаго. Племя жабракоў толькі на гэтае і здольна. А дзяржава яшчэ падахвочвае. Бо на большае, як паказваюць канкрэтныя справы, не здольная.

Сцяпан Ярашчук

Фестываль нацыянальных культур стане сапраўдным святам!

Фактычна зацверджана праграма III Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў Гродне 2-4 чэрвеня 2000 года. Падчас чарговага пасяджэння аргкамітэта 16 сакавіка было паведамлена, што ўрачыстае адкрыццё фестывалю пройдзе ўвечары 2 чэрвеня на Савецкай плошчы горада. Пасля гэтага адбудзецца гала-канцэрт з удзелам прафесійных і самадзейных калектываў, а затым — харэаграфічнае і танцавальнае святы.

3 чэрвеня ў гістарычным цэнтры горада будуць працаваць нацыянальныя «падворкі», дзе кожнае з 16 нацыянальных аб'яднанняў зможа правесці конкурс, паказаць сваю культурную праграму, выставу мастацтваў, нацыянальных страваў і касцюмаў. Будзе праведзены конкурс нацыянальнага анекдота. Упершыню адбудзецца воднае свята з піратэхнічнымі эфектамі і канцэртам.

4 чэрвеня ў Гродна прыедуць прадстаўнікі ўсіх раёнаў вобласці. У гэты ж дзень пройдуць: абласны фестываль харэаграфіі, кірмаш дружбы, свята фальклору, дзіцячае тэатралізаванае свята.

Гала-канцэрт фестывалю будзе праведзены ў Лядовым палацы Гродна.

Ася Куніцкая

У гонар герояў-пагранічнікаў

На тэрыторыі вайсковых могілак у Гродне плануецца ўстанавіць памятны знак у гонар савецкіх пагранічнікаў, якія загінулі на Гарадзеншчыне ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

Як паведамілі у прэс-цэнтры Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў, конкурс на лепшы эскізны праект мемарыяльнага знака ўжо аб'яўлены Гарадзенскім пагранічным атрадам сумесна з гарадскімі ўладамі. Да ўдзелу запрашаюцца архітэктары, мастакі, скульптары. Галоўная ўмова вобразнага рашэння памятнага знака — філасофская аснова, арыгінальнасць ідэі і разам з тым лаканічнасць раскрыцця тэмы гераізму воінаў-пагранічнікаў.

Конкурсныя працы трэба прадставіць ва ўпраўленне архітэктуры і горадабудаўніцтва Гарадзенскага аблвыканкама не пазней чым 27 красавіка. З арганізатарамі конкурсу можна звязацца па тэлефоне ў Гродне: 47-02-74.

Вячаслаў Будкевіч

Махлярка з «Белаграпрамбанка»

Следчым аддзяленнем па Свіслацкім раёне Гарадзенскай вобласці распачата крымінальная справа ў дачыненні супрацоўніцы мясцовага аддзялення «Белаграпрамбанка».

Яна падазраецца ў тым, што падманным шляхам завалодала 1500 далярамі ЗША, якія належалі ўрачу раённай бальніцы. Згодна з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, яе дзеянні кваліфікуюцца як махлярства. Раней у адносінах да яе была распачата крымінальная справа па яшчэ адным факце махлярства. Папярэдне ўстаноўлена, што тады пры прыёмцы грашовай выручкі з харчовай крамы яна не апрыходавала амаль 761 тысячу «новых» рублёў, а выкарыстала іх на пагашэнне даўгоў.

Ася Куніцкая

«Мастоўскаму весніку» -50!

У мінулую нядзелю ў Мастах урачыста адзначылі выхад юбілейнага 50-га нумара газеты «Мастоўскі веснік». Павіншаваць мастоўскіх журналістаў прыехалі калегі з усёй вобласці. Была наладжаная цёплая, сяброўская сустрэча калектыву рэдакцыі з чытачамі. Адбыўся невялікі святочны канцэрт.

Заснавальнікам, выдаўцом і нязменным галоўным рэдактарам на працягу ўсіх трох гадоў з'яўляецца слынны беларускі дзеяч Язэп Палубятка.

Газета выходзіць накладам 299 паасобнікаў. Аднак «Мастоўскі веснік» карыстаецца вялікай папулярнасцю ў чытачоў, і таму кожны нумар памнажаецца зацікаўленымі чытачамі з дапамогай ксераксу яшчэ некалькі разоў.

«Гэтую газету хочацца чытаць, у ёй шмат надзённых матэрыялаў, адразу відаць, што яна стаіць на пазіцыях простага народу,» - зазначыў спадар Гладухаў, жыхар горада Масты.

Між іншым, гэта «заўважылі» і мастоўскія начальнікі, якім смелая і прынцыповая газета папсавала шмат крыві. Аднак нягледзячы на вертыкальны ўціск і нават судовы пераслед, людзі, якія робяць гэтае выданне, не плануюць пакінуць пачатую справу.

ПАГОНЯ віншуе нашых калегаў з «Мастоўскага весніка» і зычыць плёну ў працы і надзейных чытачоў!

Ул. інф.

«Крыніца міласэрнасці» запрашае

13 сакавіка 2000 года зарэгістраваная Гарадзенская грамадская жаночая арганізацыя «Крыніца міласэрнасці». Аснову арганізацыі складаюць шматдзетныя маці, маці-адзіночкі, а таксама маці, якія маюць дзяцей-інвалідаў. Яны аб'ядналі свае намаганні дзеля сумеснай абароны правоў і законных інтарэсаў малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, клопату пра іх здароўе.

Узначальвае арганізацыю «Крыніца міласэрнасці» Марына Самаіл, выхаванка дзіцячага дома. Ёй 29 гадоў і ў яе пяцёра непаўналетніх дзетак. Прадпрымальніцкія структуры ў арганізацыі прадстаўляе Марына Леванеўская. Яна выхоўвае чацвёра непаўналетніх дзяцей, кіруе Беларускай арганізацыяй працоўных жанчынаў г.Гродна і з'яўляецца галоўным рэдактарам бюлетэня «Марына».

Прафсаюзы прадстаўляе Ірэна Байрашэўская, старшыня Свабоднага Прафсаюза ТАА СП «Альформа». Таго самага сумеснага прадпрыемства «Альформа», дзе жанчыны аб'яўляюць галадоўкі з прычыны нізкага і несвоечасова выплочваемага заробку.

Для арганізацыі «Крыніца міласэрнасці» гарвыканкам абяцае выдзяліць памяшканне па вуліцы Леніна, 18-5 (па месцы юрыдычнага адрасу). Аднак, пакуль у «Крыніцы міласэрнасці» няма офісу, даведкі можна атрымаць па тэлефоне (0152) 47-01-75 (Марына Станіславаўна) альбо 31-30-62 (Марына Аляксандраўна).

Ул.інф.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Гэты няўлоўны даляр...

У лютым 2000 года сярэднямесячная налічаная заробная плата рабочых і служачых Беларусі, у параўнанні са студзенем, вырасла з 44 да 49 даляраў ЗША ў пераліку па рынкавым наяўным курсе.

Паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу, у рублёвым выражэнні зарплата павялічылася за месяц на 12,4 працэнта (з 38.734 да 43.542 дэнамінаваных рублёў). У той жа час наяўны курс даляра ЗША застаўся на ранейшым узроўні. У пераліку па афіцыйным курсе сярэдняя налічаная зарплата рабочых і служачых знізілася са 107 да 105 даляраў ЗША, па рынкавым безнаяўным — вырасла з 40 да 41 даляра ЗША.

Для параўнання: у лютым 1999 года налічаная зарплата складала 34 даляры ЗША ў пераліку па наяўным курсе, 46 — па афіцыйным курсе, 26 — па рынкавым безнаяўным.

***

На 22 сакавіка Нацыянальны банк Беларусі ўстанавіў наступныя афіцыйныя курсы замежных валют:

даляр ЗША — 428 беларускіх рублёў; еўра — 415,84; нямецкая марка — 212,62; расейскі рубель — 15,08.

У параўнанні з папярэднім днём, афіцыйны курс даляра вырас на 1 рубель.

На «чорным» рынку наяўнай валюты ў Менску раніцай 22 сакавіка даляр куплялі па 895 — 900 і прадавалі па 910 рублёў.

У параўнанні з папярэднім днём, курс не змяніўся.

У абменных пунктах камерцыйных банкаў даляр куплялі па 880 — 885 і прадавалі па 890 — 895 рублёў.

У параўнанні з папярэднім днём, курс не змяніўся.

Дзмітрый Уласаў

Эканомія за кошт дзяцей

Напрыканцы мінулага года ўлады Беларусі вырашылі эканоміць энерганосьбіты. На першы план была пастаўлена электрычная энергія, якую вельмі проста ўзяць пад кантроль, бо яна ўся цалкам праходзіць праз электралічыльнікі. Для гэтага Міністэрства эканомікі сваёй пастановай 146 ад 09.11.1999 года ўстанавіла ліміты выкарыстання электраэнергіі на кожнага жыхара або сям'ю. Аднак ліміты разлічваў хіба што той, хто ніколі не карыстаўся гэтай энергіяй.

Асабліва балюча дадзеныя неабгрунтаваныя разлічаныя ліміты закранулі тых жыхароў, у чыіх дамах замест газавых выкарыстоўваюцца электрапліты. Тут ліміты, на дзіва, цікавыя. Так, ліміт выкарыстання электраэнергіі на ўсе патрэбы, уключаючы і прыгатаванне ежы на электрапліце на аднагодвух чалавек, складае на месяц 170 кВт/ч. І чым большая сям'я, тым меншы ліміт з разлікам на аднаго чалавека. Так, на сям'ю з пяці чалавек устаноўлены ліміт толькі 330 кВт/ч. Гэта значыць, што на аднаго чалавека прыпадае ўжо не 170 кВт/ч і не 85 (170:2=85), а толькі 66 кВт/ч.

А як быць, калі ў кватэры жыве пяць чалавек з дзвюх сем'яў, або ў сям'і трое дзяцей рознага ўзросту? Вось якая сітуацыя ў мяне. Жыву я з жонкай і мой сын з жонкай у адной кватэры. У сям'і сына нядаўна нарадзілася дзіця. У адной кватэры - ажно пяць чалавек. Вось і «чырыкнулі» нам ліміт - 330 кВт/ч на месяц. Аднак мы з жонкай ды сын з жонкай і з дзіцём вядзем паасобны лад жыцця. Такім чынам, кожная з дзвюх сем'яў мае сваю электрапліту, лядоўку, свой тэлевізар, пыласос ды іншыя бытавыя прылады. Кожная сям'я карыстаецца імі асобна. Нас жа лічаць за адну сям'ю з пяці чалавек, таму што ў нас адзін электралічыльнік ды адна разліковая кніжка. А ліміт на пяць чалавек - 330 КВт. Раней, пакуль не было лімітаў, мы самі дзялілі расходы напалову - і ніякіх пытанняў не ўзнікала. Цяпер жа «абагульненне» нас у адну сям'ю з пяці чалавек прывяло да перарасходу выкарыстання электраэнергіі паводле ліміту.

Першыя некалькі месяцаў мы спрабавалі ўкласціся ў ліміт, эканомілі на ўсім. Аднак ні ў адным месяцы з моманту ўвядзення лімітаў, не атрымалася меней за 400-450 кВт/ч. Нават калі б нас палічылі за дзве сям'і, і то мы дапускаем перарасход, таму што на сям'ю з двух чалавек - ліміт 170 кВт/ч, а з трох - 210 кВт/ч. Такім чынам, усяго 380 КВт. Каб мы жылі па два чалавекі ў кожнай сям'і без дзяцей, то ліміт складаў бы 340 кВт/ч. Атрымліваецца, на нашае немаўлятка дзяржава выдаткавала толькі 40 кВт/ч, у той час як на дарослага - не меней як 85 кВт/ч (ліміт на сям'ю з двух чалавек - 170 кВт/ч). Бадай, аднолькавыя праблемы - у кожнай сям'і, дзе ёсць дзеці.

Аднак кожнаму зразумела, што чым большая сям'я, тым болей у ёй дзяцей. Бо трох-чатырох састарэлых у адной сям'і амаль не бывае, а калі і бывае адзін-два, то яны стараюцца трымацца асобна ад маладых. Вось і даводзіцца састарэлым альбо сядзець пры свечках, нічога сабе не варыць на электрапліце, адмаўляцца ад тэлевізара, лядоўкі ды іншых электрапрыбораў і эканоміць ліміт дзецям, альбо плаціць па «штрафных» тарыфах - у чатыры разы даражэй. Тым больш, усім вядома: дзе ў сям'і ёсць дзеці, асабліва рознага ўзросту, - гэтага ліміту, нават пры самым сціплым выкарыстанні электраэнергіі, не хопіць.

Дзеткам жа трэба варыць заўсёды свежую ежу і карміць не тры, а пяць разоў на дзень, даваць падагрэтае пітво. Калі ў хаце малыя дзеці, дык часам і ноччу не выключаецца святло, а хвораму дзіцяці і грэлачку электрычную варта ўключыць. Пялюшкі таксама даводзіцца штохвілінна прасаваць. Крыху большаму дзіцяці і тэлевізар хочацца паглядзець. І не цікавыя яму выступленні прэзідэнта або Зімоўскага з Рудамётавым, якіх і старым ужо слухаць «абрыдла». Дзеткам лепей паглядзець нейкую дзіцячую перадачу. Але на ўсё гэта ліміт не разлічаны. Ды і наогул ліміты разлічвалі тыя, хто, відаць, ні разу не карыстаўся электраплітой. Бо хто сёння гатуе на ёй, ведае, што большая фаерка за гадзіну спажывае 1,5 кВт/ч электраэнергіі. Гэта значыць, што, каб згатаваць боршч патрэбна не менш як паўтары гадзіны альбо 2,25 кВт/ч. Такім чынам, толькі на гатаванне першых страваў на электрапліце, спатрэбіцца амаль палова ліміту, адведзенага на адну асабу, альбо ўвесь ліміт на аднаго чалавека пры сям'і з дзвюх асобаў. А як быць з гатаваннем іншых страваў, вады на каву ці гарбату, з падаграваннем ежы? Ды і якую эканомію электраэнергіі можна весці там, дзе яе найменш спажываецца?

Калі верыць словам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія пачуў я аднойчы па тэлебачанні, то насельніцтвам Беларусі спажываецца толькі сем працэнтаў ад усёй электраэнергіі, спажываемай краінай. Астатнія ж 93 працэнты выкарыстоўваюцца па другіх напрамках. Вось там і трэба было ў першую чаргу «шукаць» эканоміі.

Узяць хаця б жыллёва-камунальную гаспадарку, якую штодня рэкламуюць на каналах расейскага тэлебачання, як вельмі эканомную. А ці такая яна на самой справе? Напрыклад, у нашым 12-павярховым доме ёсць невялікія адасобленыя пакойчыкі пры ўваходзе ў ліфты. Удзень яны асвятляюцца праз зашклёныя дзверы, а ўвечары уключаецца электрычнасць. Такія ж пакойчыкі ёсць на ўсіх адзінаццаці паверхах. А выключальнік лямпачак адзін на ўсе паверхі. Таму, каб выключыць святло на любым паверсе, трэба ліфтом або пешшу спускацца ўніз. Вось і гараць гэтыя лямпачкі і ўдзень, і ўначы.

За нікому не патрэбную рэкламу расіянам таксама даводзіцца плаціць немалыя грошы. А колькі яшчэ такіх прыкладаў безгаспадарчасці! Кіньце вокам, колькі паўпустых альбо цалкам пустых тралейбусаў «шнырыць» па горадзе ў той час, калі па гэтых жа маршрутах ідуць аўтобусы. А што робіцца на многіх прамысловых прадпрыемствах: цэхі стаяць, а электрычнасць спажываецца! Не лепшае становішча ў вёсках. Хіба што і на дачах узімку варта было б адключаць электрычнасць. У гэтую пару года можна абысціся і са свечкай, а так па лініях электрапередачаў ідуць страты.

Энергетыкам, перш чым разлічваць ліміты на насельніцтва, трэба было пільна прасачыць, дзе найбольш безгаспадарча выкарыстоўваецца электраэнергія, зрабіць высновы, а не эканоміць за кошт дзяцей.

Зыкфрыд Кузьма

Усё той жа Трышкін каптан

Заканчваецца першы квартал, які сваімі вынікамі шмат у чым будзе вызначаць вынікі гаспадарчай дзейнасці ўсяго 2000 года.

На жаль, вынікі за студзень і люты не пакідаюць месца для аптымізму. Асабліва калі прааналізаваць падзеі апошніх тыдняў у сферы фінансава-грашовых адносінаў, памятаючы, што стан фінансаў - своеасаблівы барометр эканомікі ў цэлым, усіх яе сацыяльных складнікаў.

У гэтым плане звяртае на сябе ўвагу нядаўняе рашэнне Нацыянальнага банка падвысіць стаўку рэфінансавання на 25 пунктаў - да 175 працэнтаў гадавых. Прычына ў тым, што ў студзені і лютым інфляцыя імкліва падвысілася і трэба было нешта рабіць для яе стрымлівання. Толькі ў студзені яна склала 14,1 працэнта і перакрыла планавы паказчык амаль у тры разы.

Але паўстае пытанне: ці здолее падвышэнне стаўкі рэфінансавання паслабіць інфляцыю? Кардынальна, на што зроблены разлік, - не здолее. Таму што не ліквідаваныя іншыя прычыны, якія выклікаюць інфляцыю.

Напрыклад, аграрны крызіс, які набыў зацяжны характар, альбо дэвальвацыя расейскага рубля, якая пагоршыла ўмовы знешняга гандлю з усходнім суседам. Нарэшце, рэзкае скарачэнне імпартных паставак тавараў у мінулым годзе, што мае месца і ў 2000 годзе. У сувязі з вышэйузгаданым належыць чакаць перш за ўсё адмоўных наступстваў падвышэння стаўкі рэфінансавання. Да прыкладу, без сумневу, гэта абмяжуе магчымасці камерцыйных банкаў набываць у Нацыянальным банку грошы для крэдытавання рэальнай эканомікі. Бо для забеспячэння станоўчага значэння працэнтных ставак па крэдыту іх трэба ўзнімаць вышэй за 175 працэнтаў. Але хто ў стане заплаціць такі кошт за крэдыты?

Фінансавая палітыка ў нашай краіне мае супярэчлівы характар. Спачатку ў памкненні напоўніць казну грашовымі рэсурсамі, перш за ўсё валютнымі, робяцца грубыя памылкі. Потым здзяйсняюцца слабыя спробы выправіць недарэчнасці. Атрымліваецца, што ўлады часта рубяць сук, на якім сядзяць.

Прыкладам можа быць устанаўленне высокіх пошлінаў на замежныя перавозкі па беларускіх дарогах. У выніку перавозчыкі з Расеі ды іншых краінаў сталі з поўначы і з поўдня аб'язджаць Беларусь, валютныя паступленні рэзка скараціліся. Хацелі шмат - не атрымалі нічога. Панеслі страты і айчынныя аўтамабілісты. Дайшло да таго, што Беларуская асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў вярнула за мяжу 880 адзінак аўтатранспартнай тэхнікі, арандаванай па лізінгу. Гэтую тэхніку можна было выкупіць і працягваць яе эксплуатацыю. Але зрабіць гэта не дазволілі высокія ўвазныя пошліны. Гадавыя страты краіны (не паступяць ні пошліны, ні падаткі) складуць прыкладна 100 мільёнаў нямецкіх марак. Непрадуманасць сённяшняй фінансавай палітыкі і яе супярэчлівая дваістасць выявіліся і падчас прыняцця нядаўняга прэзідэнцкага ўказа N100 «Аб некаторых пытаннях абавязковага продажу замежнай валюты», які быў апублікаваны 2 сакавіка, а ўвайшоў ў сілу 1 сакавіка.

Супярэчлівасць яго ў тым, што ў краіне ўжо шэраг гадоў дэкларуецца прыярытэт знешняга гандлю. У Міністэрстве замежных справаў завяршаецца распрацоўка нацыянальнай праграмы развіцця экспарту да 2005 года. Плануецца штогадовы яго прырост на 5-6 працэнтаў. І разам з тым, указ вымушае экспарцёраў, апрача раней вызначаных 30 працэнтаў, прадаваць яшчэ 10 працэнтаў валютнай выручкі! Праўда, толькі на працягу двух месяцаў - у сакавіку і красавіку. Аднак кожнаму зразумела, што гэты, па сутнасці дадатковы, падатак не будзе садзейнічаць развіццю экспарту. Аб'яўлена, што мэта дадатковага канфіскавання валюты - акумуляцыя грашовых сродкаў для закупу нафты і нафтапрадуктаў. Мэта зразумелая - хутка пачнецца веснавая сяўба. Але сродак дасягнення гэтай мэты - значны ўдар па экспарцёрах.

Стала відавочным, што сваю супярэчлівую фінансавую палітыку ўрад імкнецца кампенсаваць сродкамі рэальнай эканомікі. Уладзімір Ярмошын, які выконвае абавязкі кіраўніка ўрада, правёў спецыяльнае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў, прысвечанае пераадоленню крызісу ў жыллёвым будаўніцтве.

Пачатак прэм'ерскай дзейнасці У.Ярмошына з вырашэння жыллёвай праблемы - невыпадковы. У мінулым годзе ўвод новага жылля недавыкананы на 20 працэнтаў. Утварыўся велізарны «недабуд». Але і ў такіх умовах у студзені 2000 года выкананне плана жыллёвага будаўніцтва склала меней за 5 працэнтаў. Калі тэрмінова не выправіць становішча, то ў выніку недавыкананне гадавога плану жыллёвага будаўніцтва можа скласці больш як 40 працэнтаў. Галоўная прычына крызісу ў жыллёвым будаўніцтве - недахоп фінансавых і крэдытных рэсурсаў. Разумеючы, што надзеі на атрыманне сродкаў ад насельніцтва марныя з прычыны жабрацкіх заробкаў, на прэзідыуме ўрада знайшлі выйсце ў тым, каб стварыць спецыяльны жыллёва-інвестыцыйны фонд па прыкладу фонда падтрымкі сельскагаспадарчай вытворчасці. Стварацца ён будзе за кошт адлічэнняў ад грашовай выручкі ўсё той жа прамысловасці. Адносна такога рашэння спрэчак ва ўрадзе не было. Дыскутавалі толькі аб тым, ці то адлічаць адзін працэнт выручкі, ці то будзе дастаткова 0,5 працэнта. Канчатковае рашэнне будзе прынята бліжэйшым часам. Але трэба памятаць, што выручка складаецца не толькі з заробнай платы і прыбытку, яна ўключае таксама і выдаткі на сыравіну і амартызацыю. Так што прадпрыемствы чакае новы цяжкі падатак. І пры ўсіх абставінах атрымліваецца, што ратуем адно - нішчым другое.

Вострай праблемай фінансавай палітыкі дзяржавы з'яўляецца імкненне да адзінага валютнага курсу рубля. Падобна на тое, што сёння ўрад усвядоміў такую неабходнасць. Магчыма, пад уздзеяннем МВФ. Тым самым прызнанае памылковым штучнае падтрыманне валютнага курсу рубля. Але памылка выпраўляецца неахвотна і дужа марудна.

Так, апошнім часам стаў больш заўважна зніжацца афіцыйны валютны курс рубля: прыкладна на 1,5-2 рублі ў дзень. Але афіцыйны валютны курс рубля застаецца на ўзроўні, у два разы вышэйшым за рынкавы. Зразумела, што пры такім памкненні да адзінага валютнага курсу, мэта будзе дасягнута не менш, чым праз 200-250 дзён. Ды і то пры ўмове, што рынкавы курс не будзе мяняцца. Што, канешне, малаверагодна. Між тым, наяўнасць множнасці валютных курсаў рубля ўскладняе правядзенне прагматычнай валютнай і фінансавай палітыкі, стварае ўмовы для спекуляцыі.

Уладзімір Кулажанка,
доктар эканамічных навук,
прафесар

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

Вось дык Марыя, вось дык Бірукова!

29 лютага 2000 года сталася знамянальнай датай для намесніцы старшыні Гарадзенскага аблвыканкама Марыі Біруковай. У гэты дзень яна двойчы прамаўляла з экрана Беларускага тэлебачання. Напачатку яе слухалі і глядзелі жыхары вобласці. Крыху пазней знайшлося месца ў праграме «Панарама» рэспубліканскага тэлеэфіру.

Што ж так усхвалявала Марыю Бірукову? Відавочна, не даспадобы гэтай кіраўнічцы сталіся вынікі праведзенага ў Гродне семінару з удзелам прадстаўнікоў абласной улады і мясцовых апазіцыянераў. Такая сустрэча стала магчымай дзякуючы намаганням Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ у Менску, беларускага Міністэрства замежных справаў. Сам пан Ханс-Георг Вік у Гродна завітаў! Тут нельга было пляснуць тварам у бруд. Лепшыя «вертыкальныя» сілы былі тэрмінова падняты па трывозе, ідэйна падкаваны і забяспечаны «цифрыю».

Усё б яно нічога, неяк адбрыкнуліся. Але ж вельмі далося ў знакі выступленне былога старшыні аблвыканкама, былога старшыні абласнога Савета, дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання, аднаго з лідараў беларускай апазіцыі Сямёна Домаша. Каменя на камені не пакінуў, аналізуючы эканамічны стан рэгіёна за апошнія два-тры гады. І гэта пры шматлікіх замежных экспертах, высокіх гасцях з АБСЕ! Як выжыць!..

А свае, мясцовай гадоўлі абаронцы цяперашняга рэжыму, выглядалі слабавата. І зусім губляліся, калі пасля інфармацыйнага паведамлення прысутныя лідары партыяў і няўрадавых арганізацыяў падступаліся з пытаннямі. Хоць дапамагай небаракам! Як сорамна было слухаць іх несамавітыя блытаныя адказы...

Вось тады і ўзнікла думка пра тэлебачанне. Кажы, што хочаш, апанентаў няма, сама сабе гаспадыня. Падручныя журналісты хуценька што трэба падрэжуць, калі раптам не тое змарозіш, расставяць акцэнты, прычэшуць думкі. А яны, гэтыя думкі-згадкі, так і скачуць, як тыя белыя коні з камсамольскага юнацтва. Не зацугляць, не стрыножыць, ні прыручыць...

Тыя, хто слухаў тэлешчыраванне Марыі Біруковай, да гэтага часу не могуць уцяміць: а што хацела сказаць шаноўная таварышка? Пахваліла савецкія кампартыйныя часіны. Ну, гэта зразумела, сама працавала сакратаром абкама КПБ, кіравала ідэалогіяй, клікала народ у светлую будучыню. Іншым асабліва запомнілася фраза:» Дорогие мои! Да в 91-м году партия оставила республику и область на подъёме. За годы, которые правили те, кто относит себя к оппозиции, свободной такой оппозиции, они её бросили в страшную яму. И только с приходом президента и «вертикали» началось вытягивание». Пакінем на сумленні выступоўцы непадуладныя ёй думкі-скакуны. Паспрабуем разабрацца па сутнасці выказвання.

У 1991 годзе партыя пакінула краіну, якая скатвалася ў бездань. Ужо тады не было вялікім сакрэтам, што эканоміка СССР пачала моцна буксаваць яшчэ ў другой палове 60-х гадоў. На гэта ўвагу Палітбюро ЦК КПСС звяртаў старшыня Савета Міністраў Аляксей Касыгін, нават прапаноўваў праграму выратавання. Але нафтадаляры, як тыя ружовыя акуляры, не дазвалялі крамлёўскім старцам рэальна ацаніць становішча. Яны жылі пры камунізме. Пры развітым сацыялізме добра ўладкавалася драбнейшая партнаменклатура. А даляры тыя паспяхова закапалі ў БАМ. Засталіся з фізічна і маральна зношаным заводскім абсталяваннем. Не заўважылі, як заходні свет перайшоў да камп'ютараў, распрацаваў рэсурсазберагаючыя тэхналогіі. З часам савецкая нафта страціла свой кошт. Краіну спасцігла хвароба ўсіх імперый - развал. Так што пра КПССаўскую спадчыну неяк не вяжацца.

Цяпер пра тых, «кто правил». Марыя Бірукова заклікае «и фамилии называть серьёзно людям». Але чагосьці марудзіць, не раскрыла ніводнага прозвішча. Магчыма, таму, што сама ў той час працавала ўжо ў абласным выканаўчым камітэце. Ёй ды іншым былым партапаратчыкам, якія засталіся без работы, руку дапамогі працягнуў...Сямён Домаш. Так-так, той самы, супраць якога цяпер Марыя Міхайлаўна «со товарищи» абвяшчае крыжовы паход. Тады ў кабінетах аблвыканкама хадзіла пагалоска пра яе выказванне, маўляў, калі спатрэбіцца, пакладу галаву за старшыню аблвыканкама Сямёна Мікалаевіча.

Марыя Бірукова - тады яшчэ сціплы сакратар па ідэалогіі Гарадзенскага абкаму КПБ

Партыя навучыла сваіх сакратароў і лектараў-інструктараў трымаць нос па ветры, хутка мяняць арыенціры, падтасоўваць карты. Той люд і сёння так хлусіць пра вялікія эканамічныя здабыткі Беларусі, што будзь здароў! Вось што значыць практыка і багаты досвед! Партнаменклатура разваліла Савецкі Саюз. Яна не змянілася, нікуды не падзелася. Хіба што памяняла кабінеты ў райкамах на выканкамаўскія. Няма сумневу, што таксама паспяхова давядзе да ручкі і незалежную краіну. Лямантуючы пры гэтым, што іх ўладзе нехта перашкаджае і вораг прыцішыўся ледзь не пад кожным кустом. Адметныя танцоры, што і казаць...

Каб пераканацца, хто давёў Беларусь да цяперашняга жабрацтва, трэба толькі параўнаць паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці пачатку 90-х гадоў. Параўнаць з цяперашнімі заробкамі-пенсіямі, цэнамі ў магазінах. Як ні круці, а жылі багацей. З 1991 года па версень 1993 года вобласцю кіраваў Дзмітрый Арцыменя, які загінуў у выніку тэрарыстычнага акта. Яго забойца і сёння гуляе на волі. А новы кумір парт- і новай наменклатуры Аляксандр Лукашэнка не першы год запэўнівае, што крута разбярэцца з карупцыяй і злачынасцю.

Што да Сямёна Домаша, то ён кіраваў вобласцю крыху больш як адзін год - з кастрычніка 1993 па снежань 1994 года. Нядоўга пабыў на пасадзе старшыні абласнога Савета. І цяпер іншыя кіраўнікі прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў сведчаць, што пры ім праблемы вырашаліся аператыўна. Энергічны малады кіраўнік часцяком сустракаўся з працоўнымі калектывамі, не баяўся вострых пытанняў. Аднак не спадабаўся першаму прэзідэнту Беларусі, бо меў сваю думку, уласны погляд на развіццё краіны, не захацеў прыслужвацца. Тыя, хто найбольш кляўся ў адданасці, першымі ўключыліся ў цкаванне, рабілі ўсё, каб пазбавіцца гэтага чалавека. Вось вам узор «шчырай падзякі» за зробленае людзям дабро. Разам з ім шэрагі беспрацоўных Гарадзеншчыны папоўнілі дзесяткі разумных спецыялістаў.

Таму фалышыва гучаць словы Марыі Біруковай, што нібыта апазіцыянеры «бросили область и республику, как экономику ее...». Ды не яны кінулі, а іх выкінулі на вуліцу без права працаўладкавання толькі за тое, што разумныя, кваліфікаваныя і дасведчаныя гаспадарнікі не маглі пагадзіцца з заганнымі метадамі кіравання народнагаспадарчым комплексам. Тое, пра што яны папярэджвалі, цяпер спраўдзілася на сто працэнтаў. Народ гібее ў беспрасветным жабрацтве. Уладам вельмі хацелася, каб палітычныя апаненты з гора спіліся, страцілі чалавечую годнасць, пайшлі збіраць бутэлькі на кавалак хлеба, адышлі ад актыўнай палітычнай дзейнасці. Спадзяванні аказаліся марнымі. Маючы разумную галаву, яшчэ ніхто не прападаў. Цікава, а як павядуць сябе «гонители», калі самі сутыкнуцца з жыццёвымі выпрабаваннямі? І хто зараз першы, стане апошнім...

Усхвалявала Марыю Бірукову тое, што «безработные-оппозиционеры» ездзяць «по заграніцам». І пытанне гучыць рытарычнае: а за якія грошы? Зразумела, што не за бюджэтныя. Проста сорамна за кіруючых высокіх асобаў, няздатных здагадацца - за грошы прымаючага боку. Так прынята ў цывілізаваным свеце: хто запрашае ў паездку, той і выдаткі аплочвае. Не трэба лічыць грошы ў чужых кішэнях, гэта справа няўдзячная. Хіба што больш занятку няма. Лепей шчыра скажыце падаткаплацельшчыкам, колькі вы атрымліваеце за «высокаэфектыўную» працу, за якія сродкі самі наведваецеся за мяжу. І які перадавы досвед укаранілі ў вытворчасць, якая карысць ад вашых ваяжоў?

І апошняе. Марыя Бірукова чамусьці звяртаецца да сваіх апанентаў са словамі «браткі». Такім чынам паводзяць сябе новыя беларусы. Нахапаліся блатнога слэнгу і карыстаюцца ім у сваім асяродку. Няўжо выканкамы пераўтварыліся ўжо ў «общаки»?

Раман Верын

Пачатак «дыялогу» пакладзены

17 сакавіка ў 19.00 у раёне цэнтральнага аўтавакзала ў Менску распачаўся дыялог паміж прадстаўнікамі апазіцыі і прадстаўніком А.Лукашэнкі.

Дыялог быў вельмі кароткім. Прадстаўнік А.Лукашэнкі, карыстаючыся цемрай на неасветленым участку тунэля паміж шапікамі і аўтабуснай стаянкай, ударыў мяне кулаком па галаве. Калі нападнік пачуў маё пытанне: «Ты што, нормальны?» і ўбачыў, што я не збіраюся падаць, то ўцёк.

«Наружка» (вонкавае назіранне), якая ўвесь час суправаджала мяне, у перамоўны працэс не ўмешвалася.

Валерый Леванеўскі

Вячорка перамог Лукашэнку

У сакавіку гарадзенскі Малады Фронт правёў у Гродне моладзевае анкетаванне. Апытанне было прысвечана Дню Волі, і ўдзел у ім узялі 192 школьнікі ды студэнты ва ўзросце ад 13 да 25 гадоў.

Спектр пытанняў быў вельмі шырокі. Ад праблемы выбару «лідара нацыі» да рэлігійнай талерантнасці і пабудовы АЭС у Беларусі.

Папярэднія дадзеныя анкетавання засведчылі, што гарадзенская моладзь у сваёй пераважнай большасці не стаіць у баку ад палітычных працэсаў, якія ідуць у Беларусі.

51 працэнт апытанай моладзі - сталыя прыхільнікі палітычных партыяў. 68 чалавек выказалі падтрымку БНФ. Аднак не раім кіраўніцтву Фронта задаволена паціраць рукі, бо, як сведчаць адказы, асноўны ўплыў на моладзь аказвае не арганізацыйная дзейнасць БНФ у Гродне, а сталы і актыўны ўдзел фронтаўцаў у масавых акцыях пратэсту, у прыватнасці, Маршы Свабоды 17 кастрычніка.

15 апытаных адзначылі, што падтрымліваюць дзейнасць сацыял-дэмакратаў. Аднак, што вельмі цікава, трэцяя частка прыхільнікаў сацыял-дэмакратыі лічыць Лукашэнку годным кіраўніком Беларусі. АГП падтрымліваюць два працэнты апытаных; 4,5 працэнта - зялёны рух. Камуністы набралі ажно дваіх прыхільнікаў, а партыя Гайдукевіча наогул не каціруецца сярод моладзі Гродна. Сітуацыя з «лідарам» у моладзі такая ж, як і ў больш сталай часткі беларускага грамадства. Яскрава выражанага лідара няма, затое некалькі маюць практычна роўны працэнт. Лідзіруе Вінцук Вячорка, нядаўна абраны старшыня БНФ - годным кіраваць дзяржавай яго лічаць 29 маладых гарадзенцаў. 20 чалавек падтрымліваюць Лукашэнку, 17 - Пазьняка. Чатыры і шэсць прыхільнікаў адпаведна ў Ганчара і Чыгіра. Але ж пераважная большасць - 60,4 працэнта - лічаць, што на Беларусі «яшчэ не з'явіўся лідар, якому можна было б паверыць і за якім можна было б пайсці».

132 са 192 апытаных выступілі катэгарычна супраць інтэграцыі Беларусі і Расеі. «Беларусь павінна быць незалежнай, еўрапейскай дзяржавай» - пераважала ў адказах моладзі.

Яшчэ больш - 158 (82,2 працэнта) чалавек - назвалі бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоню» сваёй сімволікай. «Мы абавязкова вернем нашыя нацыянальныя сімвалы ў нашую Беларусь» - гэты адказ яскрава акрэсліў тыя прыярытэты, якія выбрала для сябе гарадзенская моладзь. Аматараў жа чырвона-зялёнага набралася толькі 30 чалавек, і тое, гэта пераважна былі прадстаўнікі БПСМ, якія папросту не захацелі разыходзіцца з «генеральнай лініяй».

Адным з пунктаў анкетавання было пажаданне моладзі і канкрэтна Маладому Фронту. Вось адно з іх: «Хлопцы! Больш руху і энергіі! Улада ў Беларусі трымаецца толькі на папулісцкіх здольнасцях аднаго актора! Пакажам, што мы - моц. Усе - на Дзень Волі!»

Павал Мажэйка

Дубко вывеў з комы Аграрную партыю. Навошта?

У прадчуванні парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у палітычным жыцці Гарадзеншчыны дзеючыя асобы палітычнага працэсу пачалі рабіць досыць нечаканыя рэчы. Здзівіў, напрыклад, факт правядзення напачатку сакавіка абласной «вертыкаллю» схода Аграрнай партыі. Аблвыканкам сабраў аграрыяў - сябраў партыі, якія пасля рэферэндуму сядзелі, як мыш пад мятлой, і па сутнасці прымусіў іх аднавіць сваю дзейнасць, а заадно абраць паслухмянага «вертыкалі» кіраўніка абласной арганізацыі. Гэты факт можна расцэньваць як сімптом і дыягназ стану і суадносінаў цэнтральнай і мясцовай улады ў краіне.

Адносна сімптомаў. Раней «вертыкаль» цалкам абыходзілася мажлівасцямі, якія ёй даваў механізм улады, і ніякай дапамогі падчас правядзення якіх-кольвечы кампаніяў ад палітычных партыяў не патрабавала. Рэанімацыя Аграрнай партыі паказвае, што «вертыкаль» больш не кантралюе сітуацыю толькі сродкамі ўлады, а мае патрэбу ў нетрадыцыйных спосабах упраўлення. Што нас, грамадзянаў, павінна, без сумневу, радаваць.

Цэнтральная ўлада таксама ніколі да гэтага не ўхваляла тых высокіх чыноўнікаў, якія спрабавалі весці самастойную гульню праз палітычныя ўтварэнні. Але гарадзенскі ваявода парушыў трыдыцыю. Магчыма, ягоныя пазіцыі ў сталіцы пахіснуліся, і ён шукае апірышча ў сваёй вотчыне, але і мясцовыя начальнікі вырашылі ратавацца, хто як можа. Так што парадуемся за іх і за сябе.

Калі гарадзенскі ваявода пачаў збіраць свой клан для ўдзелу ў будучым падзеле ўлады, то кідаецца на вочы, што ён можа разлічваць пакуль што на калгасных аграномаў і ветэрынараў. Кіраўнікі прамысловасці і бізнесу з горада валодаюць значна большымі арганізацыйнымі і фінансавымі магчымасцямі. Але яны не выявілі пакуль што жадання падтрымаць цяперашняе начальства. Што таксама радуе - «калгасныя паны», канешне, хочуць па-ранейшаму кіраваць краінай і гарадской большасцю, але гэтым разам у іх наўрад ці атрымаецца.

Такім чынам, шэраг сімптомаў выяўляюць дыягназ хваробы, якая называецца хранічнай легітымнай недастатковасцю і пры натуральным яе працяканні вядзе да дысфункцыяў цэнтральнай і мясцовай улады ды яе страты нелегітымнымі службовымі асобамі.

Сяргей Самасей

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Панядзелак, 27

НАШЕ КИНО

9.05 Лекарство против стресса. Жанна Глебова, Ивар Калныныш, Виталий Соломин и Мария Соломина в киноопереттe Яна Фрида "Сильва". 2 серии. 1981 г.
11.25 Мультфильм "Лев и 9 гиен". 1988 г.
11.35 Марафон премьер на канале "Наше кино". Елена Яковлева, Сергей Никоненко, Сергей Гармаш, Дмитрий Нагиев и Дмитрий Харатьян в детективе Юрия Мороза "Каменская. Смерть и немного любви". Россия - Беларусь. 2000 г.
13.20 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 5-я серия. "Загнанный".
14.15 Маргарита Володина, Олег Стриженов и Михаил Глузский в мелодраме Петра Тодоровского "Последняя жертва". 1975 г.
15.50 КиНовости.
16.00 Кинокалендарь. К юбилею Иннокентия Смоктуновского. Иннокентий Смоктуновский в киноповести Владимира Шределя "Ночной гость". 1958 г.
16.55 Дело №... Александр Збруев, Ирина Понаровская и Юрий Демич в детективе Герберта Раппапорта "Меня это не касается..." 1976 г.
18.25 Лекарство против стресса. Владимир Высоцкий и Алексей Петренко в комедии Александра Митты "Сказ про то, как царь Петр арапа женил". 1978 г.
20.00 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 6-я серия. "Дебют взломщика".
20.55 КиНовости.
21.05 Алиса Зыкина в кинодраме Вячеслава Сорокина "Соблазн". 1987 г.
22.45 Завтра в программе.
22.50 Лекарство против стресса. Ольга Андровская и Михаил Жаров в водевиле Исидора Анненского "Медведь". 1938 г.
23.35 Лекарство против стресса. Виктор Станицын и Ольга Андровская в трагикомедии Владимира Петрова "Юбилей". 1944 г.

МИР КИНО

9.35 КиНовости.
9.50 Лизел Мэттьюс, Лайам Каннигэм и Элеанор Брон в фильме-сказке Альфонсо Куарона "Маленькая принцесса" (США). С.
11.25 Дастин Хоффман и Роберт Редфорд в политическом детективе Алана Пакулы "Вся президентская рать" (США). Д-17.
13.40 Хэмфри Богарт и Ингрид Бергман в мелодраме Майкла Кертица "Касабланка" (США). Д-13.
15.20 Жаклин Биссет, Валентина Кортезе и Жан-Пьер Омон в драме Франсуа Трюффо "Американская ночь" (Франция - Италия). Д-13.
17.15 Пенелопе Крус, Фернандо Фернан Гомес и Мишель Галабрю в комедии Фернандо Труэба "Прекрасная эпоха" (Испания - Португалия). Д-17.
19.05 КиНовости.
19.20 Само Хун и Карл Мака в комедийном боревике "Тощий тигр и толстый дракон" (Гонконг). Д-13.
21.05 Ян-Майкл Винсент и Гэри Бьюзи в драме Джона Милиуса "Лето невинности" (США). Д-13.
23.00 КиНовости.
23.10 - 0.50 Сюзанна Гамильтон и Джулиан Сэндс в фильме ужасов Шимако Сато "Сказка вампира" (Япония - Великобритания). Д-17.

СПОРТ

9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 "Еще неделя позади..."
10.10 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
11.40 "Пресс-центр"
11.55 Спортивная гимнастика. Международные соревнования Гран-При "Great Four". День 1-й. Передача из Германии
14.40 "Пресс-центр"
14.55 Волейбол. Чемпионат России. Женщины. Суперфинал. Матч за 1-е место. Прямая трансляция из Екатеринбурга
16.30 "Шахматное обозрение"
17.00 "На пути в Сидней"
17.45 "Пресс-центр"
18.00 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
19.30 Хроника недели
20.00 Программа передач на завтра
20.05 "Большой ринг"
22.05 Волейбол. Чемпионат России. Женщины. Суперфинал. Матч за 1-е место. Передача из Екатеринбурга
23.35 Новости
23.50 "Железный фактор". "Мистер Олимпия". Часть 2-я

Аўторак, 28

НАШЕ КИНО

9.05 Кинокалендарь. К юбилею Иннокентия Смоктуновского. Иннокентий Смоктуновский в киноповести Владимира Шределя "Ночной гость". 1958 г.
10.00 КиНовости.
10.10 Дело №... Александр Збруев, Ирина Понаровская и Юрий Демич в детективе Герберта Раппапорта "Меня это не касается..." 1978 г.
11.40 Лекарство против стресса. Владимир Высоцкий и Алексей Петренко в комедии Александра Митты "Сказ про то, как царь Петр арапа женил". 1976 г.
13.15 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 6-я серия. "Дебют взломщика".
14.10 Алиса Зыкина в кинодраме Вячеслава Сорокина "Соблазн". 1987 г.
15.50 КиНовости.
16.00 Александр Калягин, Олег Табаков и Любовь Полищук в кинопритче Олега Рябоконя "Эзоп". 1981 г.
17.45 Мультфильм "Окно". 1966 г.
17.55 Кинокалендарь. К юбилею Олега Жакова. Олег Жаков, Ирина Мирошниченко, Олег и Глеб Стриженовы в приключенческом фильме Леонида Квинихидзе "Миссия в Кабуле". 2 серии. 1970 г.
20.05 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 7-я серия. "Тактика отчаяния".
21.00 КиНовости.
21.10 Виктор Степанов и Иван Мартынов в кинопритче Бахыта Килибаева "Гонгофер". 1992 г.
22.45 Завтра в программе.
22.50 Лекарство против стресса. Мария Барабанова, Борис Петкер и Михаил Ростовцев в комедии Михаила Вернера и Сергея Сиделева "Девушка спешит на свидание". 1936 г.

МИР КИНО

9.35 КиНовости.
9.50 Сюзанна Гамильтон и Джулиан Сэндс в фильме ужасов Шимако Сато "Сказка вампира" (Япония - Великобритания). Д-17.
11.30 Само Хун и Карл Мака в комедийном боевике "Тощий тигр и толстый дракон" (Гонконг). Д-13.
13.10 Ян-Майкл Винсент и Гэри Бьюзи в драме Джона Милиуса "Лето невинности" (США). Д-13.
15.10 Ален Делон, Жан Габен и Жерар Депардье в остросюжетном детективе Жозе Джованни "Двое в городе" (Франция - Италия). Д-13.
16.45 Стефан Гютлер, Брунхильда Клокнер и Фолкер Пехтель в исторической драме Вернера Херцога "Стеклянное сердце" (ФРГ). Д-17.
18.20 КиНовости.
18.35 Майкл Дудикофф в боевике Дэмиана Ли "Ложная цель" (США - Канада). Д-17.
20.05 Клинт Иствуд, Кайл Иствуд и Вирна Блум в фильме "Лабух" (США). Д-13.
22.05 Шарлен Тилтон и Лиа Ремини в криминальном фильме Улли Ломмеля "Звездный свидетель" (США). Д-13.
23.25 - 0.55 Эендрю Стивенс и Таня Робертс в эротическом триллере Джега Мандры "Ночные глаза" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
11.10 Хроника недели
11.40 Аэробика
12.05 "Пресс-центр"
12.20 Волейбол. Чемпионат России. Женщины. Суперфинал. Матч за 1-е место. Передача из Екатеринбурга
13.50 Спортивная гимнастика. Международные соревнования Гран-При "Great Four". День 2-й. Передача из Германии. В перерыве (15.00) - "Пресс-центр"
17.05 Фристайл. Профессиональный тур "Bumps and Jumps". 2-й этап
18.00 "Пресс-центр"
18.15 "Современная горнолыжная школа"
18.30 "Короли бильярда"
19.00 "Звездный вторник"
20.00 "Пресс-центр"
20.25 Программа передач на завтра
20.30 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
22.00 "Лучшие атлеты века". "Разные судьбы". К. Палусалу и И. Коткас
22.45 Новости
23.00 "За кулисами финала Кубка мира по биатлону

Серада, 29

НАШЕ КИНО

9.05 Александр Калягин, Олег Табаков и Любовь Полищук в кинопритче Олега Рябоконя "Эзоп". 1981 г.
10.50 КиНовости.
11.00 Кинокалендарь. К юбилею Олега Жакова. Олег Жаков, Ирина Мирошниченко, Олег и Глеб Стриженовы в приключенческом фильме Леонида Квинихидзе "Миссия в Кабуле". 2 серии. 1970 г.
13.10 Мультфильм "Окно". 1966 г.
13.20 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 7-я серия. "Тактика отчаяния".
14.15 Виктор Степанова и Иван Мартынов в кинопритче Бахыта Килибаева "Гонгофер". 1992 г.
15.50 КиНовости.
16.00 Владимир Ильин в кинодраме Евгения Цымбала "Защитник Седов". 1988 г.
16.45 Андрей Ростоцкий в приключенческом фильме Юрия Борецкого "Непобедимый". 1983 г.
17.55 Киносреда. Свадебное происшествие. Светалан Крючкова, Валентина Талызина, Олег Борисов и Алексей Петренко в комедии Виталия Мельникова "Женитьба". 1977 г.
19.35 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 8-я серия. "Герои и битвы".
20.25 КиНовости.
20.35 Беседы о кино с Эммануилом Виторганом. Композитор Евгений Дога.
21.05 Галина Беляева, Олег Янковский, Кирилл Лавров и Леонид Марков в мелодраме Эмиля Лотяну "Мой ласковый и нежный зверь". СССР - ФРГ. 1978 г.
22.50 Завтра в программе.
22.55 Лекарство против стресса. Иван Скуратов и Анна Комолова в комедии Бориса Барнета "Старый наездник". 1940 г.

МИР КИНО

9.35 КиНовости.
9.45 Ален Делон, Жан Габен и Жерар Депардье в остросюжетном детективе Жозе Джованни "Двое в городе" (Франция - Италия). Д-13.
11.20 Клинт Иствуд, Кайл Иствуд и Вирна Блум в фильме "Лабух" (США). Д-13.
13.20 Майкл Дудикофф в боевике Дэмиана Ли "Ложная цель" (США - Канада). Д-17.
14.50 Шарлен Тилтон и Лиа Ремини в криминальном фильме Улли Ломмеля "Звездный свидетель" (США). Д-13.
16.15 Страна на кинокарте мира. Китай. "Инь и янь. Многоликое китайское кино".
17.20 День рождения звезды: Кристофер Ламберт. Кристофер Ламберт, Эммануэль Сенье и Диего Абатантуоно в фантастическом фильме Габриэле Сальваторесса "Нирвана" (Италия - Франция - Великобритания). Д-17.
19.15 КиНовости.
19.30 Джули Эндрюс, Уильям Холден, Роберт Лоджа и Розанна Аркетт в комедии Блэйка Эдвардса "С.У.Ч. (Стандартно употребляемая чушь)" (США). Д-17.
21.30 Грэг Генри и Лесли Нильсен в приключенческом боевике "Патриот" (США). Д-17.
23.00 - 0.50 Макс фон Сюдов и Шелли Уинтерс в криминальной драме Мауро Болонини "Большое варево" (Италия). Д-17.

СПОРТ

9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
11.10 "Современная горнолыжная школа"
11.25 "Короли бильярда"
12.00 "Пресс-центр"
12.15 Аэробика
12.40 "Звездный вторник"
13.40 "Лучшие атлеты века". "Разные судьбы". К. Палусалу и И. Коткас
14.30 "Шахматное обозрение"
15.00 "Пресс-центр"
15.15 Фристайл. Профессиональный тур "Bumps and Jumps". 2-й этап
16.10 "Современная горнолыжная школа"
16.30 Самбо. Чемпионат России. Передача из спорткомплекса "Измайлово"
17.30 "Мастер-класс". Шахматная школа
17.55 "Пресс-центр"
18.10 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
19.40 "НХЛ - Плюс"
20.00 "Пресс-центр"
20.15 Программа передач на завтра
20.20 Полеты на воздушных шарах. Чемпионат мира
20.50 Спортивные танцы. Гран-При среди профессионалов
22.35 "Короли бильярда"
23.05 Новости
23.20 "НХЛ - Плюс"

Чацвер, 30

НАШЕ КИНО

9.05 Владимир Ильин в кинодраме Евгения Цымбала "Защитник Седов". 1988 г.
9.50 КиНовости.
10.00 Андрей Ростоцкий в приключенческом фильме Юрия Борецкого "Непобедимый". 1983 г.
11.10 Лекарство против стресса. Светлана Крючкова, Валентина Талызина, Олег Борисов и Алексей Петренко в комедии Виталия Мельникова "Женитьба". 1977 г.
12.45 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 8-я серия. "Герои и битвы".
13.40 Беседы о кино с Эммануилом Виторганом. Композитор Евгений Дога.
14.05 Галина Беляева, Олег Янковский, Кирилл Лавров и Леонид Марков в мелодраме Эмиля Лотяну "Мой ласковый и нежный зверь". СССР - ФРГ. 1978 г.
15.50 киНовости.
16.00 Валерий Смирнов и Наталья Егорова в кинодраме Михаила Никитина "Мой боевой расчет". 1987 г.
17.35 Олег Даль, Владимир Высоцкий, Анатолий Папанов и Людмила Максакова в киноповести Иосифа Хейфица "Плохой хороший человек". 1973 г.
19.10 Лекарство против стресса. Георгий Вицин, Инна Кмит и Александр Ширвиндт в комедии Семена Деревянского и Михаила Сусловича "Она Вас любит". 1956 г.
20.30 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 9-я серия. "Цена головы".
21.20 КиНовости.
21.30 Борис Ташкентский в музыкальном фильме Николая Соловцова "Черный жемчуг". 1999 г.
22.45 Завтра в программе.
22.50 Нина Алисова, Ольга Пыжова и Анатолий Кторов в кинодраме Якова Протазанова "Бесприданница". 1936 г.

МИР КИНО

9.35 КиНовости.
9.50 Макс фон Сюдов и Шелли Уинтерс в криминальной драме Мауро Болонини "Большое варево" (Италия). Д-17.
11.40 Кристофер Ламберт, Эммануэль Сенье и Диего Абатантуоно в фантастическом фильме Габриэле Сальваторесса "НИРВАНА" (Италия - Франция - Великобритания). Д-17.
13.35 Грэг Генри и Лесли Нильсен в приключенческом боевике "Патриот" (США). Д-17.
15.05 Джули Эндрюс, Уильям Холден, Роберт Лоджа и Розанна Аркетт в комедии Блэйка Эдвардса "С.У.Ч. (Стандартно употребляемая чушь)" (США). Д-17.
17.05 КиНовости.
17.20 Гэри Дэниэлс в фантастическом боевике Альберта Пьюна "Человек против киборга" (США). Д-13.
18.50 Эдвард Альберт, Ольга Кабо, Виктор Вонг, Евгений Лазарев и Олег Видов в приключенческом фильме "Бегущий по льду" (США). Д-13.
20.50 КиНовости.
21.05 День рождения звезды: Уоррен Битти.Уоррен Битти, Аннет Бенинг, Пирс Броснан, а также Кэтрин Хэпберн в мелодраме "Любовная история" (США). Д-13.
22.50 - 0.20 Брайан Уиммер, Джеймс Сиккинг и Яфет Котто в триллере Дугласа Барра "Знак смерти" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
11.10 Сётокан каратэ. Чемпионат России. Передача из Москвы.
11.40 "НХЛ - Плюс"
12.00 "Пресс-центр"
12.15 Аэробика
12.40 Полеты на воздушных шарах. Чемпионат мира
13.10 "Большой ринг"
15.10 "Пресс-центр"
15.25 Хоккей. Чемпионат России. Финал. 3-й матч
18.00 "Пресс-центр"
18.15 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
19.45 Хоккейный вечер
20.25 "Пресс-центр"
20.40 Программа передач на завтра
20.45 "Теннис ATP". Тележурнал
21.15 Баскетбольное обозрение НБА
22.00 "Мир скорости". Тележурнал
22.30 Хоккейный вечер
23.00 Новости
23.15 "Теннис ATP". Тележурнал

Пятніца, 31

НАШЕ КИНО

9.05 Валерий Смирнов и Наталья Егорова в кинодраме Михаила Никитина "Мой боевой расчет". 1987 г.
10.40 КиНовости.
10.50 Олег Даль, Владимир Высоцкий, Анатолий Папанов и Людмила Максакова в киноповести Иосифа Хейфица "Плохой хороший человек". 1973 г.
12.25 Лекарство против стресса. Георгий Вицин, Инна Кмит и Александр Ширвиндт в комедии Семена Деревянского и Михаила Сусловича "Она Вас любит". 1956 г.
13.45 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 9-я серия. "Цена головы".
14.35 Борис Ташкентский в музыкальном фильме Николая Соловцова "Черный жемчуг". 1999 г.
15.50 КиНовости.
16.00 Олег Даль, Марина Неелова и Анастасия Вертинская в музыкальной сказке Надежды Кошеверовой "Тень". 1971 г.
17.30 Мультфильм "Ограбление по-..."
17.50 Черно-белое золото. Лариса Голубкина, Олег Борисов, Анатолий Кузнецов и Анатолий Папанов в комедии Эльдара Рязанова "Дайте жалобную книгу". 1964 г.
19.15 Киножурнал. "Звезды полотняного неба. Иван Мозжухин".
19.25 Сериал "Д.Д.Д. Досье детектива Дубровского". 10-я серия. "Кто есть Ху?"
20.20 КиНовости.
20.30 Евгений Леонов и Николай Караченцов в трагикомедии Виталия Мельникова "Старший сын". 2 серии. 1975 г.
22.40 Завтра в программе.
22.45 Лекарство против стресса. Марина Ладынина, Сергей Лукьянов, Клара Лучко и Екатерина Савинова в музыкальной комедии Ивана Пырьева "Кубанские казаки". 1949 г.

МИР КИНО

9.35 КиНовости.
9.45 Эдвард Альберт, Ольга Кабо, Виктор Вонг, Евгений Лазарев и Олег Видов в приключенческом фильме "Бегущий по льду" (США). Д-13.
11.40 Моника Скаттини и Марко Мессери в комедии Рики Тоньяцци "Цыпленок, цыпленок, цыпленок" (Италия). Д-17.
11.55 Брайан Уиммер, Джеймс Сиккинг и Яфет Котто в триллере Дугласа Барра "Знак смерти" (США). Д-17.
13.25 Гэри Дэниэлс в фантастическом боевике Альберта Пьюна "Человек против киборга" (США). Д-13.
14.55 Уоррен Битти, Аннет Бенинг, Пирс Броснан, а также Кэтрин Хэпберн в мелодраме "Любовная история" (США). Д-13.
16.40 КиНовости.
16.55 Дэнни Де Вито, Грегори Пек и Пенелопа Энн Миллер в романтической комедии Нормана Джуисона "Чужие деньги" (США). Д-13.
18.35 Кристофер Ламберт, Кэри Хироюки Тагава, Бриджит Уилсон и Робин Шу в фантастическом боевике Пола Андерсона "Смертельная битва" (США). Д-13.
20.15 Джон Туртурро, Лили Тейлор и Уилл Паттон в комедии Брэндона Коула "Гараж" (США). Д-13.
21.50 КиНовости.
22.05 Аманда Пламмер, Кэтлин Куинлан и Форест Уайтэкер в драме Кифера Сазерленда "Последний свет" (США). Д-17.
23.45 - 1.15 Зак Галлиган, Майкл Нури и Кэтрин Мэри Стюарт в триллере Джорджа Михалки "Экстрасенс" (США). Д-17.

СПОРТ

2.00 Хоккей.Чемпионат НХЛ. "Вашингтон Кэпиталз" - "Питтсбург Пингвинз". Прямая трансляция из США По окончании трансляции в программе перерыв до 9.00
9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
11.10 Хоккей.Чемпионат НХЛ. "Вашингтон Кэпиталз" - "Питтсбург Пингвинз". Передача из США. В перерыве (11.50) - "Пресс-центр"
13.40 Баскетбольное обозрение НБА
14.10 Тайский бокс
15.10 "Пресс-центр"
15.25 Хоккей. Чемпионат России. Финал. 4-й матч
18.00 "Пресс-центр"
18.15 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Передача из США
19.45 "Пресс-центр"
20.00 Программа передач на завтра
20.05 "Power Week- неделя НХЛ"
21.00 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Полуфинал. Прямая трансляция из США
22.30 Новости
22.45 Хоккей.Чемпионат НХЛ. "Вашингтон Кэпиталз" - "Питтсбург Пингвинз". Передача из США

Субота, 1

НАШЕ КИНО

9.00 Сегодня в программе.
9.05 Ирина Розанова, Валерий Яременко, Алексей Зотов и Сергей Колтаков в фильме "Привет от Чурли-трубача". 1998 г.
10.20 Мультфильм "Ограбление по-..."
10.40 Олег Даль, Марина Неелова и Анастасия Вертинская в сказке "Тень". 1971 г.
12.10 Киножурнал: "Звезды полотняного неба. Иван Мозжухин".
12.20 Евгений Леонов и Николай Караченцов в трагикомедии "Старший сын". 2 серии. 1975 г.
Совершенно серьезно...
Праздничный вечер на канале "Наше кино".
14.30 Лариса Голубкина, Олег Борисов, Анатолий Кузнецов и Анатолий Папанов, а также Юрий Никулин, Георгий Вицин и Евгений Моргунов в комедии Эльдара Рязанова "Дайте жалобную книгу". 1964 г.
16.00 Анатолий Папанов и Сергей Филиппов, Ростислав Плятт и Рина Зеленая, Юрий Никулин, Георгий Вицин и Евгений Моргунов в комедийном "Совершенно серьезно". 1961 г.
17.05 Мультфильм "Комната смеха". 1991 г.
17.15 Светлана Савелова, Николай Парфенов, Алексей Смирнов, Валентин Смирнитский, Евгений Весник, а также Юрий Никулин, Георгий Вицин и Евгений Моргунов в комедии "Семь стариков и одна девушка". 1968 г.
18.35 Юрий Никулин, Георгий Вицин и Евгений Моргунов в комедии Леонида Гайдая "Самогонщики". 1961 г.
18.50 Арчил Гомиашвили, Сергей Филиппов, Михаил Пуговкин, Наталья Варлей, Юрий Никулин и Георгий Вицин в комедии Леонида Гайдая "12 стульев". 2 серии. 1971 г.
21.25 Мультфильм "И смех и грех". 1978 г.
21.35 Арчил Гомиашвили, Евгений Моргунов и Георгий Вицин в комедии "Комедия давно минувших дней". 1980 г.
22.55 Завтра в программе.
23.00 Юрий Куценко, Евгений Сидихин, Валерий Приемыхов и Иван Охлобыстин в фильме Максима Пежемского "Мама, не горюй!" 1997 г.

МИР КИНО

9.35 Аманда Пламмер и Форест Уайтэкер в драме "Последний свет" (США). Д-17.
11.20 Календарь "Мира кино". Тосиро Мифуне.
11.35 Кристофер Ламберт, Бриджит Уилсон и Робин Шу в боевике Пола Андерсона "Смертельная битва" (США). Д-13.
13.15 Дэнни Де Вито, Грегори Пек и Пенелопа Энн Миллер в романтической комедии Нормана Джуисона "Чужие деньги" (США). Д-13.
14.55 Джон Туртурро, Лили Тейлор и Уилл Паттон в комедии "Гараж" (США). Д-13.
16.30 Приключенческий фильм "Белый клык". (Франция - Испания - Италия). С.
18.10 Календарь "Мира кино". Тосиро Мифуне.
Вечер смеха
18.25 Комедия "Маленькие гиганты" (США).
20.10 Сделано в Голливуде. 1975 г.
20.35 Майк Майерс, Хезер Грэм и Майкл Йорк в комедии Джея Роуча "Остин Пауэрс: шпион, который меня соблазнил" (США). Д-13.
22.10 Комедия Гэри Росса "Плезантвилль" (США). Д-13.
0.10 - 1.55 Комедия Питера Фаррелли "Тупой и еще тупее" (США). Д-13.

СПОРТ

4.00 Баскетбол. Чемпионат НБА. "Шарлотт Хорнетс" - "Торонто Рэпторс". Прямая трансляция из США По окончании трансляции в программе перерыв до 9.00
9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Полуфинал. Передача из США
11.10 "Лучшие атлеты века". "Разные судьбы". К. Палусалу и И. Коткас
11.55 "Пресс-центр"
12.10 Аэробика
12.35 "Power Week- неделя НХЛ"
13.25 "Щит и мяч". Передача о баскетболе
13.55 Волейбол. Чемпионат России. Мужчины. Суперфинал. 1-й матч. Прямая трансляция из Екатеринбурга
15.30 "Пресс-центр"
15.45 "16 дней в тундре". Последняя гонка века на собачьих упряжках.
16.45 Баскетбол. Чемпионат НБА. "Шарлотт Хорнетс" - "Торонто Рэпторс". Передача из США
19.10 "Пресс-центр"
19.25 Программа передач на завтра
19.30 "Большой ринг"
21.30 "На пути в Сидней"
22.15 "Щит и мяч". Передача о баскетболе
22.45 Новости
23.00 Тайский бокс

Нядзеля, 2

НАШЕ КИНО

9.05 Комедийный киноальманах "Совершенно серьезно". 1961 г.
10.10 Мультфильм "Комната смеха". 1991 г.
10.20 Комедия Евгения Карелова "Семь стариков и одна девушка". 1968 г.
11.40 Комедия Леонида Гайдая "12 стульев". 2 серии. 1971 г.
11.55 Комедия Леонида Гайдая "12 стульев". 2 серии. 1971 г.
14.30 Мультфильм "И смех и грех". 1978 г.
14.40 Комедия Юрия Кушнерева "Комедия давно минувших дней". 1980 г.
16.00 Фильм "С днем рождения, или "Инкогнито". 1986 г.
16.50 Мелодраме Павла Чухрая "Клетка для канареек". 1983 г.
18.05 Николай Рыбников и Инна Макарова в кинодраме Александра Зархи "Высота". 1957 г.
19.35 Детектив Юрия Мороза "Каменская. Чужая маска". Россия - Беларусь. 2000 г.
21.20 Дмитрий Харатьян, Мария Зубарева, Марина Зудина и Лия Ахеджакова в комедии Андрея Разумовского "Мордашка". 1990 г
22.45 Завтра в программе.
22.50 Виктор Цой в криминальной драме Рашида Нугманова "Игла". 1988 г.

МИР КИНО

9.35 Сделано в Голливуде. 1975 г.
10.00 Джим Кэрри и Джефф Дэниэлс в комедии Питера Фаррелли "Тупой и еще тупее" (США). Д-13.
11.45 Тоби Магуайр, Джефф Дэниэлс и Риз Уизерспун в фантастической комедии Гэри Росса "Плезантвилль" (США). Д-13.
13.45 Экранизация. Приключенческий фильм Лучио Фульчи по роману Джека Лондона "Белый клык". В ролях: Франко Неро и Вирна Лизи (Франция - Испания - Италия). С.
15.30 Рик Моранис, Эд О'Нил и Сюзанна Томпсон в семейной комедии "Млаенькие гиганты" (США). С.
17.15 Майк Майерс, Хезер Грэм и Майкл Йорк в комедии Джея Роуча "Остин Пауэрс: шпион, который меня соблазнил" (США). Д-13.
18.50 Мэтт Диллон, Фэй Данауэй и Гэри Синиз в остросюжетной драме Кевина Спейси "Альбино-аллигатор" (США). Д-13.
20.25 Алек Болдуин, Майкл Китон, Джина Дэвис и Вайнона Райдер в фантастическомй комедии ужасов Тима Бартона "Битлджюс" (США). Д-13.
21.55 Проект "Догма" на канале "Мир кино". Ибен Ейле и Андерс Бертхельсен в фильме Сорена Краг-Якобсена "Последняя песнь Мифуне" (Дания - Швеция). Д-17. Премьера.
23.35 Дастин Хоффман, Рене Руссо, Морган Фримен и Дональд Сазерленд в приключенческом фильме Вольфганга Петерсена "Эпидемия" (США). Д-13.

СПОРТ

9.00 "Пресс-центр"
9.15 Аэробика
9.40 "На пути в Сидней"
10.25 "Щит и мяч". Передача о баскетболе
11.00 "16 дней в тундре". Последняя гонка века на собачьих упряжках.
12.00 "Пресс-центр"
12.15 Аэробика
12.40 "Шахматное обозрение"
13.20 К началу турнира на призы журнала "Мир женщины"
13.40 "Пресс-центр"
13.55 Волейбол. Чемпионат России. Мужчины. Суперфинал. 2-й матч. Прямая трансляция из Екатеринбурга
15.30 Художественная гимнастика. Международный турнир на призы журнала "Мир женщины". Прямая трансляция из Дворца спорта "Динамо". В перерыве (16.30)- "Пресс-центр"
18.30 Спортивные танцы. Гран-При среди профессионалов
20.15 "Пресс-центр"
20.30 "Мир скорости". Тележурнал
21.00 "Еще неделя позади..."
21.30 Программа передач на завтра
21.35 Фристайл. Профессиональный тур "Bumps and Jumps". 2-й этап
22.30 Теннис. Турнир из серии Masters "Ericsson Open". Финал. Прямая трансляция из США.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

РЭКЛАМА Тэлефон: (0152) 72-29-96, 72-37-14

ПРАДАЮ

АЎТАМАБІЛІ, ЗАПЧАСТКІ, ГАРАЖЫ

ВАЗ-21011 на запчасткі. Тэл. 93-68-30 (пасля 15.00).

Масквіч-412, 1974 г.в., па запчастках. Звяртацца: г.Гродна, вул.Томіна, 10-47б.

Масквіч-2140, 1986 г.в. Кошт - 250 у.а. Тэл. 6-07-17.

Аўтамабіль М-20 «Победа» ў аварыйным стане. Танна. Тэл. у г.Масты 2-27-16 (спытаць Юрыя).

Рухавік да аўтамабіля «Шэўрале Дзівіжн», 1943 г.в., у непрацоўным стане. Тэл. 5-55-09 (увечары).

Капот да аўтамабіля Форд-Сіера; тэлевізар «Электрон». Танна. Тэл. 2-65-60.

Генератары да трактароў МТЗ. Тэл. 2-92-08 (пасля 19.00).

Металічны гараж у раёне таксапарка (кошт - 300 у.а.); плафон таксі (кошт - 20 у.а.). Тэл. 2-93-86.

Прычэп-дачу (1996 г.) разам з двума ўмывальнікамі, ацяпляльнай печчу і газавай плітой. Тэл. у Ваўкавыску 2-07-20.

НЕРУХОМУЮ МАЁМАСЦЬ

Трохпакаёвую кватэру ў Шчучыне з усімі выгодамі. Тэл. 2-15-70 (пасля 18.00).

Аднапакаёвую кватэру ў Гродне (вул.Гагарына, другі паверх). Варыянт: мяняецца гэтая кватэра і адзін пакой у 2-пакаёўцы ў Менску на аднапакаёўку ў Менску. Тэл. у Гродне 2-37-11, тэл. у Менску 52-34-92.

Дзвюхпакаёвую прыватызаваную кватэру ў г.п.Рось; новы гараж. Тэл. (212) 3-20-27.

Трохпакаёвую кватэру ў в/г Слабудка Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, танна; дом у Лінава-2. Тэл. 75-13-97.

Дом у цэнтры г.Гродна, 2-узроўневы, трохпакаёвы: хол, камін, усе выгоды, каля дома - гараж; а таксама дом у вёсцы. Тэл. 47-17-89.

Драўляны дом у в.Касцевічы (2 км ад Ваўкавыска). Танна. Тэл. у Ваўкавыску 5-16-52.

Трохпакаёвы дом у г.Гродна; дом у в.Алекшыцы. Тэл. 47-17-89.

Дом ашалёваны у в.Крамец Стаўбцоўскага раёна, ёсць гаспадарчыя пабудовы, калодзеж, сад, 30 сотак зямлі. Тэл. 3-07-60.

Добраўпарадкаваную дачу з сажалкай, ёсць 11 сотак, агарод, будуецца лазня. Тэл. 6-46-32.

Жылы дом у в.Крушіцы Мастоўскага раёна, 6х12, ёсць усе гаспадарчыя пабудовы, вялікі пляц, агарод у 20 м - р.Шчара. Можна пад дачу. Тэл. у Шчучыне 2-44-57.

Дачу ў раёне в.Навумавічы. Тэл. 76-19-29.

Дачу з добрым домікам і садам - недалёка ад Фолюша, 2 км ад Баранавічаў. Тэл. 44-09-01.

Цагляны дом у г.п.Рось, ёсць прыродны газ. Тэрмінова. Тэл. у Ваўкавыску 4-34-75.

Драўляны дом у в.Масты-Левыя (4 км ад г.Масты), ёсць 12 сотак зямлі, гаспадарчыя прыбудовы, недалёка - лес, рака Нёман, гандлёвы цэнтр. Тэл. у г.Масты 2-27-16 (спытаць Юрыя).

УСЁ РАЗАМ

Вагонку, плінтус, налічнік. Тэл. 72-30-27.

Новую дубовую бочку-кубялец для засолкі мяса ці агародніны, ёмістасцю 60 літраў; новую паршнявую групу да «Масквіча». Танна. Тэл. 31-98-61.

Японскі тэрмас блакітнага колеру ёмістасцю 2,5 літра. Кошт - 8 мільёнаў. Тэл. 33-46-02.

Лыжы, спальныя мяшкі, палатку. Тэл. 47-35-26.

Канапу-ложак, два крэслы-ложкі. Тэл. 76-19-29.

Асеннія чаравікі (памер 37); зімовыя боты (памер 35), усё б/у. Тэл. 5-92-07 (пасля 18.30).

Кухню імпартную, халадзільнік «Ока-6», усё б/у; батарэю новую (10 рэбраў). Тэл. 31-24-73.

Швачную машыну «Подольск», ЗВЧ-печ «Электроника»; баян «Этюд», кухню «Кристина». Тэл. 31-05-69.

Новы фотапавелічальнік «Крокус». Тэл. 99-31-99.

Відэакамеру «Sony CCD-TR 44 NTSC». Танна. Тэл. 7-55-95.

Блок сілкавання рэгулюемы 1-12 В; канвертар FM (радыё РОКС, СТАЛІЦА»). E-mail: vyi a mail.ru

Капёл цвёрдага паліва для вадзянога ацяплення, калонку для падачы вады, прыватызаваны дачны ўчастак у вёсцы Яскевічы. Тэл. 76-28-84.

Камп'ютарную прыстаўку «Subor». Тэл. 76-28-84.

Новую аўтамагнітолу «CLARION». Тэл. 47-84-80.

Блок-сценку «Міраж», халадзільнік «Снайге», пральную машыну «Мара», каляровы тэлевізар «Гарызонт»; усё б/у. Звяртацца на адрас: пасёлак Паўднёвы, вул.Рагачоўскага, 7-24 (у любы зручны час).

Старажытныя іконы, скандый. Тэл. 6-49-55.

Магнітафон-прыстаўку «Вега-122», узмацняльнік «Вега» ў камплекце; аўтамагнітолу «Pioneer». Усё б/у. Танна. Тэл. 73-00-00 (аб. 95352).

Шубу мужчынскую (штучнае футра); фотасветлафільтры, карнізы, дыпламат, кружэлкі, трансфарматар, люстру. Усё б/у. Тэл. 33-59-87.

Плашчы мужчынскія (памеры 46-54); паліто жаночае, дэмісезоннае (памер 46-48); чахол да гітары; хрэстаматыю і самавучыцель на шасціструнаай гітары; энцыклапедыю БССР (3 тамы, 1980 г.). Тэл. 33-79-95.

Польскую ілюстраваную кніжку «Пісьма святыя Новага Тэстаменту». Тэл. 33-46-02.

Жыгулёўскія пакрышкі з камерамі, шкло задняе для Запарожца; тульскі баян; дарожку дывановую; люстру нямецкай вытворчасці; бра; авальнае люстэрка; восі да УАЗ; вялікі кактус - агара (гаючая расліна). Тэл. 33-14-27.

Руска-беларускі слоўнік у трох тамах (5-е выданне, 1994 год) пад рэдакцыяй Я.Коласа, К.Крапівы, П.Глебкі. Тэл. у Менску (017) 258-43-54.

Кнігу: Кастусь Каліноўскі. Творы, дакументы. - Мн.: Беларускі к[illegible] 1999 г. Тэл. (017) 258-43-54.

«Святое Евангелле» на рускай мове. Тэл. 33-46-02.

Газавы балон з рэдуктарам, кошт - 5000 рублёў; а таксама падольскую ручную швачную машыну б/у, кошт - 15000 рублёў. Звяртацца на адрас: праспект 40 гадоў Перамогі, д.11, кв.19 (спытаць Міхаіла).

Шчанюкоў французскага бульдога. Тэл. 72-63-93.

КУПЛЮ

Персанальны камп'ютар з сецявой картай; таблеткі «Хінідзін». Тэл. 73-00-00 (аб. 95352).

Дзіцячае харчаванне «Беллактсоя». Тэл. 47-35-26.

Фарбу «сурык». Тэл. 33-14-27.

Кружэлкі з запісамі класічнай музыкі, опер, аперэтаў. У добрым стане. Танна. Звяртацца на адрас: 231600, Гарадзенская вобл., г.Масты, вул.Пралетарская, 35/2 ці на нумар працоўнага тэлефону 3-20-94 з 9.00 да 18.00 - акрамя нядзелі (запрасіць Сяргея).

Ламінаваную дрэва-пліту. Тэл. 73-00-00 (аб.95352).

Новую мыйку сталёвую 60х60 см. Тэл. 2-92-08.

VW Golf-2, танна; дакументы на іншамарку. Тэл. у Гродне 5-17-72, тэл. у Лідзе 5-32-66.

Набуду планы-схемы беларускіх месцаў (г.Менск не прапаноўваць). Тэл. (8-01776) 51-3-13.

Аэрограф. Пісаць: 230009, г.Гродна, вул.Друскеніцкая, д.12-2 (Юрыю).

Камп'ютарную прыстаўку на CD дысках «Sony Play Station». Тэл. 76-28-84.

Паперу фармату А2-А4 у пачках і рулонах (танна), канверты. Тэл. 31-30-62.

ЭЛЕКТРИЧЕСКИЕ
Самые низкие цены!
■ Кабели, провода
■ Щитки, щиты
■ Светильники
(0152) 72-11-08

Каляровы манітор «SVGA», б/у. Танна. Тэл. 73-00-00 (аб.95352).

Антыкварыят, старыя манеты, узнагароды, гадзіннікі. Тэл. 72-02-26.

Пыласос б/у - на запчасткі. Тэл. 6-45-74.

Пісьмовы стол, непаліраваны, цёмнага колеру. Тэл. 73-00-00 (аб.95352).

Каталог «Панасонік 1998/1999» (тэле-відэа-аўдыётэхніка). Тэл. у Ваўкавыску 4-49-81, 4-49-05.

Значкі дэпутатаў ВС БССР, СССР, Беларусі, кнігу «Птицы Белоруссии». Тэл. 47-19-64.

Куплю наступныя выданні: 1) «Беларуская энцыклапедыя» т.1; 2) «Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі» т.1; 3) «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», т.4; 4) Энцыклапедычны даведнік «Беларусь». На абмен прапаную: 1) Міхась Ткачоў «Замкі і людзі»; 2) Кастусь Тарасаў «Памяць пра легенды»; 3) Генадзь Сагановіч «Невядомая вайна»; 4) кніжкі з серыі «Нашы славутыя землякі». Тэл. 47-24-00.

ПАСЛУГІ

Абследаванне і лячэнне хранічных захворванняў па методыцы Р.Фоля. Ліц. МЗ РБ N224 да 30.XII.2001 года. Тэл. (8-017) 258-88-14.

Выканаю чарцяжы. Тэл. 72-73-19 (увечары).

Відэаздымка. Якасна выканаем [illegible]оты па стварэнню відэафільма пра Ваш лёс, юбілей, прэзентацыі. Ліц. N613, выд. МК да 2004 г. Выязджаем на месца здымкі на сваім транспарце. Тэл. у Ваўкавыску 2-34-86.

Пераклады з польскай мовы на расейскую, беларускую і наадварот. Кошт адной старонкі - 150 тысяч рублёў. Тэл. 5-33-70.

Польская, ангельская, балгарская, беларуская, расейскія мовы: пераклады, індывідуальнае навучанне. Тэл. 2-85-77.

Кладу печы - якасна і з душою. Тэл. 6-46-32.

Выканаю з дуба ці хваіны плінтус, налічнік і г.д. Тэл. 91-46-86.

Доктар С.КАЛЯДА: інтэнсіўная псіхатэрапія АЛКАГАЛІЗМУ, ЗАЛІШНЯЙ ВАГІ. Найноўшыя методыкі. Тэл. 74-35-46 (да 18.00). Ліц. N796 па 2004 г., МЗ РБ.

Усё па гісторыі. Тэл. 47-35-26.

Дапамагу студэнтам у выкананні кантрольных, курсавых, дыпломных работ па будаўнічых дысцыплінах, уключаючы фізіку, супрамат, тэхнічную і тэарэтычную механіку. Тэл. 72-16-55.

Рэпетытарства. Польская мова. Тэл. 2-55-40 (пасля 19.00).

Рэпетытарства па фізіцы. Дапамагу ў рашэнні задачаў, кантрольных работаў. Тэл. 76-55-14 (запрасіць Юрыя).

Ангельская мова: пераклады, дапамога студэнтам і школьнікам, шмат рэдкай літаратуры і падручнікаў. Тэл. 72-48-84 (пасля 15.00).

Набор тэкстаў, табліцаў на камп'ютары. Раздрукоўка на струйным альбо матрычным прынтары. Танна. Не абавязкова на Вашай паперы. Тэл. 93-53-56.

Гітара: урокі класічнай ігры па скарочанай методыцы з кароткім азнаямленнем з асновамі элементаў тэорыі музыкі і музычнай гармоніі. Тэл. 72-16-55.

Паслугі ветэрынарнага ўрача. Ліц. 10-264 да 2002 года, выдадзеная Міністэрствам с/г. Тэл. 2-73-48.

МЯНЯЮ

Аднапакаёвую кватэру на пятым паверху на такую ж на першым паверху. Тэл. 44-97-30.

Трохпакаёвую кватэру (134 кв.м, 5-ы паверх) на такую ж на першым паверху. Магчымы варыянты. Тэл. 2-59-23.

Палову дома у Ваўкавыску на кватэру. Тэл. у Ваўкавыску 5-16-52.

Дзве кватэры на добры вялікі дом. Тэл. 2-59-23, 2-27-78.

Дзвюхпакаёвую кааператыўную прыватызаваную кватэру (агульнай плошчы 41,8 кв.м; жылой - 25,9 кв.м) на дзвюхпакаёвую кватэру ў другім раёне. Звяртацца на адрас: вул.Горкага, д.94, кв.29 (пасля 18.00).

Аднапакаёвую кватэру ў г.Алексін Тульскай вобласці на раўнацэнную ў любым горадзе Беларусі. Тэл. (8-212) 3-12-53.

ЗДЫМУ

Дзвюх-чатырохпакаёвую кватэру новай планіроўкі. Тэл. 31-30-62.

Гарадзенскі цэнтр абароны правоў спажывальніка здыме памяшканне пад офіс ці юрыдычны адрас. Тэл. 31-30-62.

Аднапакаёвую ці дзвюхпакаёвую кватэру ў раёне Грандзіцкага рынка. Кошт 30-40 у.а. Тэл. 72-37-14 (з 10.00 да 17.00).

Аб'яднаная Грамадзянская партыя здыме памяшканне пад офіс (20-50 кв.м) у Гродне. Тэл. 31-30-62.

РОЗНАЕ

Шукаю працу перакладчыка (балгарская, польская мовы) альбо іншую сур'ёзную працу. Тэл. 2-85-77.

Шукаю працу па падшыўцы і падклейванню падэшваў у абутку. Тэл. 31-77-41 (у любы зручны для вас час).

Шукаю працу па зборцы мэблі, навесцы карнізаў, набораў для ванай, люстэркаў, паліцаў, сушылак і г.д. Тэл. 47-32-36.

Збіраю архіў незалежнага беларускага друку. Набуду ўсе незарэгістраваныя выданні (на Вашых умовах). Буду ўдзячны за супрацоўніцтва. Тэл. (8-0172) 213-49-83, 283-26-62.

Шукаю працу па нарэзцы пратэктару шынаў легкавых, грузавых машынаў усіх марак. Тэл. 44-39-15.

Шукаю працу масажыста. Тэл. 39-94-46.

Здаю напракат: прыстаўку «Нота», фотаапарат, прас, кнігі. Звяртацца на адрас: 230001, г.Гродна, да запатрабавання, п/п КН 137530.

Патрабуецца тынкоўшчык. Тэл. 72-11-09.

Жадаеце паглядзець відэакасеты на беларускай мове: «Адважнае сэрца», «Ісус», «Пяты элемент»? Тады дасылайце лісты на адрас: 220107, г.Менск, а/с 150 альбо тэлефануйце на нумар (017) 213-43-52, 240-78-01.

Брыгада прафесійных грузчыкаў шукае разгрузачна-пагрузачную працу (у любы зручны час). Тэл. 47-32-36, 72-79-18.

Шукаю працу па абіўцы мяккай мэблі. Забяру непатрэбную старую мэблю. Тэл. 44-39-15.

Шукаю працу (вышэйшая адукацыя). Валодаю рускай, беларускай, польскай (размоўнай), ангельскай мовамі. Шукаю спонсараў для выдання сваіх празаічных ды вершаваных твораў. Лісты дасылайце на адрас: 230012, г.Гродна, завулак Даватара, д.10, кв.53 (Андрэю Заянчкоўскаму).

Выстава аўдыё-відэа-кнігапрадукцыі працуе па новым адрасе: г.Гродна, вул. К.Маркса, 11, 2-і паверх. Чакаем вас кожны панядзелак і сераду з 17 да 20 гадзін.

Шукаю працу на даму. Тэл. 76-39-71.

Шаноўныя сябры! Выканаўчае бюро Асамблеі пераехала. З намі можна зьвязацца па тэлефоне-факсе 210-40-75, альбо зьвярнуцца на E-mail: ngo@user.unibel.by

ЗНАЁМСТВЫ

Мужчына, 45/173/75, лідчук, пазнаёміцца з прыстойнай стройнай жанчынай да 42 гадоў, для сур'ёзных адносінаў. Пісаць: 231300, г.Ліда, Галоўпаштамт, да запатрабавання п/п П-ДР N704727.

Шукаю прыстойную жанчыну, якая мае жылую плошчу, для стварэння сям'і. Пра сябе: 33/165, жанаты не быў, па нацыянальнасці - беларус, па знаку Задыяка - Скарпіён. Лісты чакаю на адрас: 230025, г.Гродна, Галоўпаштамт, да запатрабавання, п/п IV-ДР N706368.

Мужчына, 32/172, пазнаёміцца з жанчынай для сур'ёзных адносінаў з мэтай стварэння сям'і. Пісаць: 231960, г.п. Свіслач, да запатрабавання, п/п КН 0185762.

Прыстойная жанчына пазнаёміцца з добрым, інтэлігентным мужчынам да 52 гадоў, высокага росту, якога духоўныя каштоўнасці цікавяць не менш, чым матэрыяльныя. Тэл. 33-90-05.

ВІНШАВАННІ

Віншую *Андрэя Мялешку* зь пераабраньнем на пасаду старшыні Гарадзенскага Маладога Фронту! Посьпехаў!

Зьміцер зь Дзятлаўшчыны

Гарадзенскі ўікэнд

Гісторыка-археалагічны музей. Стары замак. Выстава «Гродна, адкрыты археолагамі». **Новы замак. Авальная зала.** Выстава з музея гісторыі рэлігіі - «Біблія - кніга кніг». **Сенатарская зала.** З 23 сакавіка - выстава твораў Ніны Пялюзінай. Батык.

Галерэя «Тызенгаўз» (пл. Тызенгаўза, 4). Выстава жывапісу Ігара Сільвановіча.

Галерэя «У Майстра» (вул. Кірава, 14). З 23 сакавіка - выстава Яўгеніі Станінай і Вадзіма Лагуна пад назвай «Герой». Лямец.

Музей Гісторыі Гарадніцы (вул. Ажэшкі, 37). Выстава «Мілы сэрцу куток», жывапіс.

Выставачная зала Саюза мастакоў. Працяг фотавыставы з Польшчы.

Галерэя «Раскоша» (вул. Ажэшкі, 39а). Выстава антыкварыяту і твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Цэнтр народнай творчасці (Савецкая,8). Выстава традыцыйнага рамяства Гарадзеншчыны. Ткацтва.

Дом мастацкай і тэхнічнай творчасці моладзі (Замкавая,13). Выстава мастацкай фатаграфіі.

Музей Максіма Багдановіча запрашае з 10.00 да 18.00. Выхадныя дні: нядзеля, панядзелак.

Тэатр лялек. 25 сакавіка - «Алі-баба і разбойнікі»; 26 сакавіка - «Неверагодны ілюзіён». Пачатак спектакляў у 12.00. Для дарослых: 24 сакавіка - «Тутэйшыя».

Драмтэатр. 25 сакавіка - спектакль «Кароль, Дама, Валет»; 26 сакавіка - «Рагнеда і Уладзімір»; 29 сакавіка - «Татуіраваная ружа». Пачатак спектакляў 19.00. Дзецям: 26 сакавіка ў 12.00 «Па зялёных узгорках акіяна».

Канцэрты: Новы замак - 25 сакавіка ў 18.30 - «Высокім складам рускага раманса». Гарадскі Дом культуры - 24-25 сакавіка - канцэртныя праграмы Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў скрыпічнай музыкі.

Газета ПАГОНЯ
Запрашае на працу
пенсіянераў, студэнтаў, школьнікаў і часова непрацуючых - для распаўсюджвання нашай газеты!
Тэл. 72-37-14, 72-29-96

ПАГОНЯ купон прыватнай бясплатнай аб'явы

9 **Імя і прозвішча** _____

_____

Адрас (тэлефон) _____

_____

Рубрыка _____

Тэкст _____

_____

_____

_____

Аб`явы, дасланыя на купонах, друкуюцца ў першую чаргу; неразборліва напісаныя аб'явы не друкуюцца

Купон з тэкстам адпраўце па пошце на адрас: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11

Рэдакцыя газеты ПАГОНЯ абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасады кіраўніка аддзела рэкламы і маркетынгу.

Абавязковыя ўмовы:
амбітнасць,
камунікабельнасць,
досвед працы.

Даведкі па тэлефонах: 72-29-96, 72-37-14.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПЯРЭСТЫ КУТ

Аб шыраце духоўнай дбай...

Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.
Максім Багдановіч

Так атрымалася, што магілу Максіма Багдановіча ў Ялце наведаў раней, чым завітаў у Гарадзенскі музей Паэта. Затое ў 2000 годзе «кампенсаваў» сваю непаваротлівасць: двойчы пабываў у музеі Максіма-Кніжніка.

...У Гродне Багдановічы жылі з 1892 года (паэт нарадзіўся ў Менску 9 снежня 1891 года). Тут бацька - Адам Ягоравіч, памочнік бухгалтара Сялянскага зямельнага банка - зняў чатырохпакаёвую кватэру ў доме Агульніка, на Старым Свеце. Тут тупацелі па тагачасных вузкіх вулачках маленькія ножкі нашага Стараціма-лебедзя. Тут яго дзіцячыя вачаняты замілоўваліся веліччу Нёмана («...прыпадыме бацька-Нёман на хрыбце магутны лёд») і старажытных касцёлаў Гародні. Тут жа ён сядзеў самотны на крэсле ў свае няпоўныя пяць гадкоў над труной любай маці, Марыі Апанасаўны. Яна памерла ў 27 гадоў (дарэчы, Максім і таго меней - у 25 год 5 месяцаў і 16 дзён) і пахавана на старых могілках Гародні. У 1991 годзе на яе магіле, нарэшце, пастаўлены помнік.

Музей Максіма Багдановіча працуе з 1982 года. У 1994 годзе ён адчынены ў новым будынку - на скрыжаванні вуліцаў М.Багдановіча і Першага Мая. Бескарысліва над яго стварэннем папрацавалі празаікі Аляксей Карпюк і Янка Брыль, паэткі Данута Бічэль-Загнетава (былая дырэктарка музея), Ларыса Геніюш ды іншыя. Музей спалучыў адрэстаўраваную мемарыяльную кватэру (гасцёўня, пакоі маці, бацькі, дзіцячы пакой), гістарычную і літаратурную залы, дзе прадстаўленыя наша спадчына, Гарадзеншчына літаратурная, гісторыя сям'і Багдановічаў. З замірaннем сэрца ўзіраешся ў арыгіналы-экспанаты: драўляную інкруставаную шкатулку (падарунак Адама Ягоравіча Марыі Апанасаўне), лыжачку для гарбаты з манаграмай «М.Б.», дзіцячыя пасведчанні аб нараджэнні, фотаздымкі маці і Максіма, бацькоў і трох сыноў, перапіску Максіма Багдановіча, шматлікія копіі дакументаў. Тут жа - адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» - «З друкарні пана Марціна Кухты», пазнейшыя выданні. Максім «уваскрошаны» ў дрэўцы: у маленькім вазончыку расце кіпарысік, выгадаваны клапатлівымі рукамі супрацоўнікаў музея з зернейка кіпарыса над яго магілай у Ялце.

Максім Багдановіч выйшаў з расейскамоўнай сям'і - і стаў класікам беларускай літаратуры (чым не добры знак для сённяшняй айчыннай моладзі, якая расце ў тутэйшых расейскамоўных сем'ях?). Так, лёс надоўга разлучыў яго з Беларуссю. Ды ў сваіх светлых думках і снах ён быў заўсёды з любай сэрцу «краінай-браначкай», з яе «цвятком радзімы» - васільком...

Дырэктар музея Алена Гайко паведаміла:

- Наш калектыў малады, працалюбівы. І наведвальнікі часцей да нас ідуць. Радуе тое, што спярша з бацькамі і настаўнікамі, затым - з сябрамі. Прыязджаюць з розных куткоў Беларусі. У гэтым годзе былі дэлегацыі з Польшчы і Швецыі. Маем шмат творчых задумак, якія намагаемся ажыццявіць. «Багацеем», маем цікавыя набыткі ў 2000 годзе:

- прыгожы настольнік пачатку XX стагоддзя, выраблены ў тых ялцінскіх мясцінах, дзе знаходзіцца магіла М.Багдановіча;

- пяць прадметаў посуду вытворчасці М.Кузняцова (XIX ст.), ужо выкарыстаныя ў экспазіцыі музея;

- набыты друкаваныя выданні канца XIX - пачатку XX стст.: творы Г.Гаўптмана і А.Стрынберга, Л.Талстога і Г.Гэйнэ; вучэбны геаграфічны атлас поўнага гімназічнага курса А.Ільіна (верагодна, ім карыстаўся М.Багдановіч); каляндар 1917 года на рускай мове; «Хрэстаматыі беларускае літаратуры: XI век - 1905 год»

- кніга М.Гарэцкага Віленскага беларускага выдавецтва Б.Клецкіна, 1922 год (дзве апошнія - падарунак музею гарадзенскага краязнаўцы С.Дразда). Ім жа падараваны цікавыя дакументы і фотаздымкі з карціны Пётра Сергіевіча «Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 года» з аўтографам жывапісца і графіка;

- уяўляе каштоўнасць кніга на польскай мове Фелікса Канечнага, выдадзеная ў 1922 годзе, з віншаваннем і пячаткай;

- асноўны фонд музея папоўніўся і друкаванымі выданнямі сучасных паэтаў і празаікаў, а таксама навуковай літаратурай, напрыклад, «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» (у пяці тамах, Менск, 1993-1998 гг.), які падараваў музею неўтаймоўны руплівец Беларушчыны - старшыня Рэспубліканскага ТБМ Алег Трусаў. Адчуваем сябе няёмка пры размяшчэнні экспанатаў з-за нашае цясноты: у драўляным будынку пражывае некалькі сем'яў, што не маюць аніякага дачынення да музея. Ім трэба выдзяліць новыя кватэры, каб мы маглі пашырыць плошчу музея. Гэта не наша прыхамаць, а неабходная рэальнасць...

...Да 110-ай гадавіны са дня нараджэння Паэта еўрапейскага кшталту - Максіма Багдановіча - Гародня павінна ўвекавечыць памяць свайго Сына годным помнікам. Урэшце рэшт, ёсць жа ў горадзе музей і помнік сучасніцы М.Багдановіча - польскай пісьменніцы Элізе Ажэшка. А як сказаў Антон Луцкевіч, «...Пясняр Чыстае Красы ніколі ня можа быць забыты і будзе таксама прамаўляць да душы і сэрца нашых унукаў, як прамаўляе цяпер да нас».

«Аб шыраце духоўнай дбай», - клікаў нас Волат Беларускай Паэзіі - Максім Багдановіч. Будзьма ж дастойнымі запавету Стараціма-лебедзя - моцнага, гордага птаха - Паэта Бацькаўшчыны!

Леанід Раманенка,
выдатнік народнай асветы

Гарадзенец, які сустракаўся з Янкам Купалам

Няшмат засталося на гэтым свеце людзей, якія асабіста ведалі і памятаюць Янку Купалу. Гарадзенец Франц Віктаравіч Гінтаўт - адзін з тых, хто ў маладыя гады неаднаразова сустракаўся з вялікім песняром, быў блізка знаёмы з яго маці, сёстрамі, жонкай.

Нядаўна 80-гадовы Франц Гінтаўт выдаў кнігу «З картатэкі памяці», дзе прыгадаў былое. Каштоўнасць выдання ў тым, што аўтар распавядае пра малавядомыя староннкі жыцця сям'і Луцэвічаў. Бацькі Франца арандавалі кавалак зямлі побач, таму падлетку часцяком даводзілася быць у хаце будучага Народнага паэта, гутарыць з яго роднымі і сваякамі. Гэтае сяброўства працягвалася доўгія дзесяцігоддзі. З кнігі становяцца зразумелымі вытокі таленту Купалы, узгадваюцца імёны людзей, якія спрычыніліся да яго першых крокаў у літаратуру (Зыгмунт Чаховіч, Антон Лявіцкі-Ядвігін Ш.). Аўтар называе засценкавых шляхцюкоў, ажыўленых пасля ў неўміручай камедыі «Паўлінка», драме «Раскіданае гняздо». Надзвычай цёпла ўзгадвае Франц Гінтаўт родныя мясціны Купалы - вёскі Ляўшова, Акопы, Селішча, увогуле так званую Лысагоршчыну, што на Лагойшчыне.

Сам Франц Віктаравіч паводле парады Янкі Купалы вучыўся «на настаўніка», скончыў менскі Белпедтэхнікум, спасцігаў навуку ва універсітэце, аднак у 1933 годзе быў арыштаваны, асуджаны і высланы ажно пад Уладзівасток. Вучобу ўдалося закончыць пазней у Расеі.

Гэты чалавек сябраваў з паэтам Сяргеем Астрэйкам і празаікам Лукашом Калюгам, якія загінулі ў сталінскіх ГУЛАГах, неаднойчы бачыў Коласа, Міхася Чарота, Андрэя Александровіча... Франц Гінтаўт прайшоў пакручастымі дарогамі беларускага інтэлігента. 22 сакавіка яму спаўняецца 80 гадоў. Кніга «З картатэкі памяці» выдадзена Гарадзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы.

Антон Лабовіч



Па гарызанталі: 7.Летні сорт ігрушы. 8.Аповесць Міхася Чарота. 10.Груз вялікай вагі. 11.Куды адпраўляюцца ў апошні шлях? 12.Мноства. 14.Артылерыйскі боепрыпас. 16.Краіна, дзе вынайшлі вілку і лыжку. 17.Гліняная пасудзіна. 19.Кім быў бацька Рэмбрандта. 20.Народ у Дагестане. 24.Іначай - сарыч. 25.Частка слова. 26. «Цень бацькі Гамлета». 30.Халодны будынак для захоўвання збожжа, мукі. 31.Эрмітаж па сутнасці. 32.Амерыканскі страус. 33.Травастой. 34.Брудная справа для дзяржаўных мужоў.

Па вертыкалі: 1.Раённы цэнтр у Віцебскай вобласці. 2.Дужка вядра. 3.Рэспубліка у Расеі. 4.Люстэрка душы. 5.Самая паўнаводная расейская рака. 6.Абласны цэнтр на Украіне. 9.Высакагорны казак. 13.Шматгадовая травяністая расліна з ліловымі кветкамі. 15.Узараны палетак. 17.Ручны млын. 18.Маленькая пасудзіна, а столькі ў ёй патануло! 21.Густа-чырвоны колер. 22.Пара, момант. 23.Беларускі паэт. 27.Антыатэізм. 28.Царква ў Гродне. 29.Тое ж, што і камель. 32.Тонка скручаная пража.

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў N8:

Па гарызанталі: 7.Забарона. 8.Небарака. 10.Лукша. 11.Вольскі. 12.Кендыр. 14.Пернік. 16.Сцяна. 17.Шпак. 19.Дзятва. 20.Тварог. 24.Дула. 25.Шляга. 26.Апарат. 30.Хустка. 31.Вітушка. 32. «Алеся». 33.Хуткасць. 34.Глыбокае.

Па вертыкалі: 1.Жарновец. 2.Бродскі. 3.Англія. 4.Неба. 5.Надзея. 6.Аколышак. 9.Якасць. 13.Жніво. 15.Назва. 17. «Шкода». 18.Хваля. 21.Бурундук. 22.Ігумен. 23.Ваўкалак. 27.Патрэба. 28.Скопас. 29.Святло. 32. «Асцё».

Дзевяць плюс адзін

Першыя дзевяць пытанняў з'яўляюцца своеасаблівым тэстам на ўзровень вашай эрудыцыі. Правільныя адказы на іх змешчаныя ніжэй. На дзесятае пытанне конкурсу трэба адказаць пісьмова на адрас рэдакцыі (на паштоўках ці канвертах пазначыць - «9+1»). Сярод лістоў ды паштовак з правільнымі адказамі будзе праведзена лёсаванне, якое і вызначыць, хто ж стане пераможцам і атрымае прыз ад рэдакцыі нашай газеты.

1. Сімвалам жаночай прыгажосці, пяшчоты з'яўляецца...

а) каліна; б) вярба; в) лотаць.

2. Упершыню стаў прадаваць марозіва на вуліцах сіцылійскі гандляр Пракопіа ды Кальтэллі, і адбылося гэта ў...

а) 1836 годзе; б) 1745 годзе; в) 1630 годзе.

3. Хто з'яўляецца аўтарам навелы «Дракула»?

а) Жан Грэнье;
б) Эдгар Алан По;
в) Брэм Стокер.

4. Зелянуха - гэта...

а) прыток рэчкі;
б) лясная птушка з зеленаватым пер'ем;
в) двухкрылае куслівае насякомае.

5. На дзвюх выспах - Зеландыя і Амагер - месціцца еўрапейская сталіца...

а) Капенгаген;
б) Стакгольм;
в) Рэйк'явік.

6. Паводле падлікаў арганізатараў чэмпіяната свету па футболу-98, продаж сувеніраў з сімволікай першынства свету толькі ў Францыі павінен быў прынесці...

а) 2 мільярды франкаў;
б) 3 мільярды франкаў;
в) 5 мільёнаў франкаў.

7. Вустрыцы змяняюць свой пол у залежнасці ад...

а) тэмпературы вады;
б) узросту;
в) пары году.

8. Царыца Артэмісія пабудавала ў Галікарнасе для свайго мужа тое, што стала адным з цудаў свету:

а) Акадэмію;
б) Форум;
в) Маўзалей.

9. Навуковец Йенсен, які ў 1590 годзе вынайшаў мікраскоп, па свайму пахожанню быў...

а) ангелец;
б) галандзец;
в) амерыканец.

Правільныя адказы:
16, 2в, 3в, 4а, 5а, 6б, 7а, 8в, 9б

Дзевяць правільных адказаў - выдатна, 7-8 - вельмі добра, 5-6 - добра, 3-4 - здавальняюча, менш як 3 - у Вас ёсць над чым папрацаваць.

10. У 1932 годзе золаташукальнікі знайшлі мумію чалавека памерам 36 сантыметраў. Загаманілі пра нізкарослых людзей, племя якіх спакон веку жыло ў Амерыцы. У 1979 годзе мумію аб'явілі парэшткамі дагістарычнага дзіцяці. Што вам вядома пра далейшае вывучэнне гэтай муміі?

Адказ на дзесятае пытанне папярэдняга конкурсу (гл. ПАГОНЮ N2 ад 13 студзеня г.г.): самым характэрным прыёмам мантыкі ў Вавілоніі была варажба па вантробах ахвярных жывёлаў, асабліва па печані. Пазней гепатаскапію запазычылі рымляне.

На жаль, сярод адказаў чытачоў на гэтае пытанне правільных не было. Спадзяемся, гэтым разам вам абавязкова пашчасціць атрымаць прыз ад рэдакцыі нашай газеты. Дасысылайце, калі ласка, свае версіі адказаў, нават калі яны падаюцца вам неверагоднымі.

Гараскоп

Баран (21.03-20.04). Не прысвячайце ўвесь свой час толькі каханню. Хутка можаце расчаравацца.

Бык (21.04-20.05). Для Вас надышлі рамантычныя дні. Хтосьці завалодае Вашымі думкамі - рыхтуйцеся.

Блізняты (21.05-21.06). Вам усміхнецца Фартуна. Ва ўікэнд атрымаеце добрую прапанову ад знаёмага.

Рак (22.06-22.07). Добрая паласа. Аднак будзьце ўважлівым(-ай) на дарогах.

Леў (23.07-23.08). У справах пашанцуе больш, чым у каханні. Зважайце на тое, што гаворыце.

Панна (24.08-23.09). Венера ў Вашым знаку паспрыяе палымянаму каханню. Выедзьце, нарэшце, у падарожжа.

Шалі (24.09-23.10). Калі ставіце ўсё на карту ў справах, парайцеся са спецыялістам. Верагодныя поспехі.

Скарпіён (24.10-22.11). Вас чакае ўдача ў справах. Зоркі варожаць дзіўны ўікэнд.

Стралец (23.11-21.12). Вы сумуеце па далёкім падарожжы. Але паспяховым яно будзе, калі складзеце план адпачынку.

Казярог (22.12-20.01). Добрая нагода для паездкі, нават рызыкоўнай. Можаце даверыцца некаму з-пад знаку Рака.

Вадалей (21.01-19.02). Будзьце ўважлівымі пры размове з калегамі, бо цяжка будзе пазбавіцца ад плётак. Узрадуе спатканне з Паннай.

Рыбы (20.02-20.03). Партнёр(-ка) чакае ад Вас дакладнага адказу, нават калі Вы зараз не можаце прыняць рашэння.

ПАГОНЯ
Заснавальнік: культурна-асветніцкі фонд "Бацькаўшчына"

Адрас рэдакцыі: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11. Тэл.72-37-14, 72-35-61, факс 72-29-96. E-mail: pagonia@irex.minsk.by Падпісны індэкс: 63124.

Рэгістрацыйны нумар 597. Нумар газеты надрукаваны ў Гарадзенскай абласной узбуйненай друкарні. Адрас: 230023, г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4. Замова 1 040 Наклад 8 370 Нумар падпісаны да друку ў 16.00 22.03.2000 г.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі. Якасць друку адпавядае прадастаўленым рэдакцыяй дыяпазітывам.

Галоўны рэдактар *Мікола Маркевіч*

Камп'ютарны набор: *Аксана Бурдзюк*, камп'ютарная вёрстка: *Аляксей Салей*

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013